Пётр Божка ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Пётр Сэльвясюк ☞ 3

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 42 (2631) Год LI | Беласток, 15 кастрычніка 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Прыехала камісія

Сеймавая камісія па справах нацыянальных і этнічных меншасцей (16 дэпутатаў) прыехала на Беласточчыну ледзь у чатырох асобах: старшыня Яўген Чыквін (СЛД), Генрык Кроль (Нямецкая меншасць), Аркады Фідлер (ПО) і Казімеж Клейна (кашуб, намеснік старшыні, ПО). Значыць гэта, што не было кворуму (патрабуецца траціна дэпутатаў, каб у час таго выязнога пасяджэння аб чым-небудзь вырашыць).

— Мы прынялі такую практыку: вырашаем, выслухаўшы заявы ў глыбінцы, на чарговым пасяджэнні, праз пару дзён. Цяжка на выязное пасяджэнне сабраць усіх дэпутатаў, — сказаў „Ніве" дэпутат-старшыня Яўген Чыквін. — Тым больш цяпер з гэтым цяжка, з-за гарачага часу ў Сейме, а і шмат дэпутатаў мае волю быць у сваіх акругах.

Як мы даведаліся, не толькі ў акругах „сваіх" спраў пільнавалі дэпутаты Камісіі па справах нацменшасцей. Двое з іх, напрыклад, „пільнавала" спраў у Грузіі. А хоць бы Данута Гаярская (Самаабарона) увогуле рэдка бывае на пасяджэннях.

— Пані дэпутатка ходзіць сваімі сцежкамі, мабыць, ёсць у гэтай камісіі, бо ўрэшце ж трэба быць у якойсьці, — пракаментаваў адзін з працаўнікоў канцылярыі камісіі.

Уразіла адно: у час пабыўкі сеймавай камісіі на Беласточчыне аказалася, што былы да гэтай пары старшыня БГКТ стаў віцэ-старшынёй новай беларускай арганізацыі — Таварыства беларускай культуры. Прытым не сам ён аб гэтым паінфармаваў, а вестка прагучала з вуснаў Дануты Главацкай-Мазур, якая выконвае абавязкі дырэктара Дэпартамента нацыянальных меншасцей Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Сеймавая камісія на выязным пасяджэнні прабывала на тэрыторыі былога Беластоцкага ваяводства два дні. Пачала візіт з наведання Святой Гары Грабаркі. Першая частка пасяджэння праводзілася ў Пачатковай школе н-р 3 у комплексе беларускіх школ у Бельску-Падляшскім. Разам з настаўнікамі, дырэктарамі і самаўрадаўцамі вялася размова аб пытаннях беларускага школьніцтва.

Гасцей сапраўды прафесійна прывіталі дзеці і моладзь з дзейнічаючых пры комплексе калектываў. Госці слухалі з хваляваннем таксама дэкламацыі вершаў па-беларуску. Зараз жа пасля афіцыйнага адкрыцця пасяджэння віцэ-міністр адукацыі Славамір Класоўскі прадставіў апрацаваны па заказе камісіі рапарт аб стане адукацыі дзяцей і моладзі беларускага паходжання. Аказалася, што за апошнія гады скарачаецца колькасць пачатковых школ з беларускай мовай, а затым і лік вучняў, якія яе вывучаюць.

— Лікі паказваюць, што назіраецца пэўная тэндэнцыя, над якой можна задумацца. Трэба тут, аднак, прыняць пад увагу таксама агульны дэмаграфічны спад, — адзначыў віцэ-міністр.

І так у 1990/1991 гадах такіх школ было 48. Лік падаў з году ў год; праз год было іх толькі 25. Адпаведна вучняў пачатковых школ было 3 033 і 1 722.

— Гэтая з'ява спалучаецца таксама з натуральнай тэндэнцыяй, якая вынікае са спосабу жыцця, значыць, з міграцыяй і асіміляцыяй, асабліва ў прафесійных групах.

Віцэ-міністр Класоўскі выказаў словы прызнання настаўнікам за ўключэнне ў апрацоўку праграм навучання і падручнікаў:

— Вашы падручнікі задавальняюць як нават найбольш патрабавальных настаўнікаў, так і розныя групы вучняў сваім багаццем.

Аднак агаварыўся:

— У маштабе краіны мы ідзем у напрамку абмежавання падручнікавых прапаноў.

Адной з праграм навучання, якія чакаюць заканчэння дапушчаючай працэдуры, пералічанай у міністэрскім рапарце, з'яўляецца праграма аўтарства Аліны Ваўранюк „Мой свет" — інтэграваная адукацыя. Пры нагодзе выявілася, што на гэты год не падавалася ў Міністэрства адукацыі ніводная заява (раней падаваліся БГКТ) на арганізаванне дэкламатарскіх конкурсаў на беларускай мове: для пачатковых школ „Роднае слова", для вучняў сярэдніх школ на тэатральны агляд ды на конкурсы тэатральных калектываў і беларускай песні. БГКТ, якое ганарылася гэтымі мерапрыемствамі, магло падаць такія заявы восенню мінулага года, значыць, яшчэ да кантролю МУСіА і адмаўлення датацыі з-за парушэння закона аб публічных фінансах (гаворка м.інш. пра пабудову лесвіцы ў сядзібе таварыства).

У час дыскусіі настаўніца, а раней метадыст беларускай мовы пры Беластоцкай кураторыі асветы Тамара Русачык кранула пытанне непрызнавання ў Польшчы дыпломаў выпускнікоў беларускіх вышэйшых школ. Пытанне гэтае настолькі спрэчнае, што датычыць таксама студэнтаў з Польшчы, якія, калі адпаведныя правілы ўступілі ў сілу, былі на апошнім курсе, значыць, як падкрэсліла Тамара Русачык, здаецца, гэты закон падзейнічаў заднім чыслом.

— Гэтыя студэнты або павялічаць групу бежанцаў з Польшчы, або групу беспрацоўных. З Бюро прызнавальнасці дыпломаў я атрымала адказ: „Ніхто ў гэтым невінаваты, што адправілі вы сваю дачку ў Беларусь". Я звяртаюся ў камісію, каб была выпраўлена гэтая памылка.

Удзельнікі пасяджэння звярталі ўвагу на тое, што не хапае экземпляраў падручнікаў, а тыя, якімі карыстаецца моладзь, ужо найчасцей паношаныя. Гражына Плашайская з Дэпартамента агульнага і спецыяльнага навучання Міністэрства адукацыі высвятляла:

— Сёлета не быў надрукаваны ніводзін беларускі падручнік з-за пэўных прычын, звязаных з выдавецтвам „Orthdruk", якое гэтым займалася.

Цікава тут адно: старшыня сеймавай Камісіі па справах меншасцей, дэпутат Яўген Чыквін — гэта адкамандзіраваны на час гэтага склікання віцэ-старшыня гэтай друкарні, якая друкуе кіраваны ім „Przegląd Prawosławny".

Гражына Плашайская заявіла, што неўзабаве зноў пачне працу

[працяг ☞ 2]

„Сацыялістычны" турызм ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Сённяшняя беларуская дзяржава не перастае здзіўляць сваёй сістэмай „асаблівага развіцця". Узяць хоць бы сферу турызму. З аднаго боку ўсяляк дэкларуецца яго падтрымка, з іншага — дзейнічаюць абсурдныя пастановы і законы. Прыкладам, прыгранічныя тэрыторыі, прылеглыя да суседніх дзяржаў — Літвы, Польшчы, Украіны, пераўтвораны ў так званыя „памежныя зоны", заехаць у якія без адмысловага дазволу забаронена. Нават у часы СССР абмежавання на ўезд на гэтыя тэрыторыі не было. А зараз жыхар Гродна права заехаць, скажам, у Астравец, не мае...

Ніва пра мінулае ☞ I

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Пад балканскім уплывам

У днях 28 і 29 верасня г.г. адбылася ў Беластоку навуковая канферэнцыя на тэму „Праваслаўная царква на Балканах і ў Польшчы". Канферэнцыю ладзіла Кафедра гісторыі Цэнтральна-Усходняй Еўропы Беластоцкага універсітэта ў супрацоўніцтве з Афінскім універсітэтам і варшаўскай Хрысціянскай багаслоўскай акадэміяй...

Ніва пра падарожжы ☞ I

Адрыяна СЕМЯНЮК

Падляшша — Бразілія

Стаю на аэрадроме Акэнце ў Варшаве і амаль дрыжу: першы раз буду ляцець самалётам ды яшчэ так далёка... Голас пагранічніка вырывае мяне з маіх думак: Дык куды ляціш, дзяўчына, у Франкфурт? Не, кажу, праз Франкфурт у Рыо-дэ-Жанейра! О-о, я і сам бы ахвотна туды паляцеў, пацешыў мяне вайсковец, і свет адразу стаў весялейшы, напружання як і не было. Я ўсміхнулася і глянула на бацькоў, якія мяне праводзілі: яны таксама ўсміхаліся...

Віншаванні!!!

Рэдакцыя „Нівы" віншуе ўсіх настаўнікаў з нагоды Вашага свята

Няхай Вашыя ўрокі будуць самымі цікавымі ў свеце, пасля якіх дзеці і моладзь аддзячаць усмешкай і словам дзякуй

9 770546 196000

Тэатр і быт

„Жыццё гэта тэатр" — часта казаў зарана адышоўшы, знакаміты пісьменнік Эдвард Стахура, а ў ягоным выказванні змяшчаецца адмоўная ацэнка, папрок. Тэатралізаванне жыцця, паводле Стахуры, вось заглушвае ў чалавеку тое, што ў ім аўтэнтычнае, сардэчнае, свежае, што з'яўляецца пазбаўленай гуманнасці канструкцыяй, кашмарным маскарадам, які падпарадкоўвае, выкарыстоўвае, знявольвае чалавека. Здаецца быць творам, які вызваліўся з-пад уплыву творцы і якому пагражае. Становіцца выраджанай, ракавай тканкай. Адным словам — цывілізацыяй.

Стахура патрабаваў выбару аўтэнтычага, паэтычнага спосабу жыцця („усё з'яўляецца паэзіяй"), які меў парваць з тэатральнасцю, агаліць яе фальш, мёртвую механіку. Ці рашэнне аб самагубстве, якое прыняў Стахура, абазначала капітуляцыю пісьменніка і заадно было трыумфам нечалавечага твора? Кожнае такога роду рашэнне пэўна з'яўляецца драмай з немагчымай для ўяўлення бліжнімі, іншымі індывідамі напругай; паколькі нашага тут жыцця далі нам адзін толькі раз на вечнасць, у дадатку па-за нашай свядомасцю, без нашага ўплыву ці нашай згоды.

Збуялым відам тэатральнасці з'яўляецца тэатр палітыкі, улады і падатлівасці; сцэна палітычных гульняў, спрэчак, змагання груп і груповак, арэна парламентарызму. Здараецца, асабліва ў маладых, неакрэплых дэмакратыях, што тая тэатралізацыя дзеянняў разнавідных партый і іх правадыроў натрапіць на нежаданне, недахоп адабрэння з боку розных колаў грамадства. І тое нежаданне выкарыстоўваюць паяўляючыеся розныя правадыры, ватажкі, што выступаюць з праграмамі ўсялякага аднаўлення, перш за ўсё маральнага, патрабуюць парваць з гульнёй, з прытворнасцю. Прапануюць яны ўвесці чысціню жыцця-быцця, чыстую праўду ды з чыстым дабром, разам з абсалютам. І, бывае, змардаваныя грамадзяне стануць патрабаваць ажыццяўлення надрэальнага ідэалу. А гэтае патрабаванне, якое паяўляецца так з боку кіруючых, як і кіраваных, каб людзіны, такія вось — кроў ад крыві, у агульнай масе незавялікія разумакі, не надта адукаваныя, сталі абавязкова анёламі, значыць, незямнымі істотамі, духовымі, значыць — таму і нялюдскімі. Баюся я, што такія патрабаванні прадказваюць вяртанне як жа ж вядомага нам усім таталітарызму, які заўжды выступаў пад лозунгамі ажыццяўлення ідэальнага дабра, ідэальнага ладу, абсалютнай, новай свабоды; дарэчы, жывуць яшчэ сярод нас людзі, якім лозунгі гітлерызму ці сталінізму выпісвалі на жывой скуры.

Тым часам кожнаму з нас, жывучаму тут і цяпер, наканавана аднесціся ды выкліку быту, пачынаючы са спраў найбольш асабістых, з уласнага „я", з месца, якое займаем у рэчаіснасці, праз быт сям'і, сяброўскай групы, жыхароў роднай вёскі ці горада, праз быт народа, аж да ўсяго чалавецтва, да космасу. Той выклік вызначае колькі кожнаму з нас трэба, каб распазнаць сваю сітуацыю ў свеце, каб пагадзіцца на экзістэнцыю пад небам неспакойным як і бясхмарным, пагодлівым. Згода на мінучае жыццё — адзін з канонаў іудзея-хрысціянскай культуры, маці нашай Еўропы. Толькі пагляд ад падстаў, з глыбі быту набліжае нас да рашэння, што ў нашым жыцці-быцці трэба змяніць, што захаваць, а што адкінуць.

Парадоксам нашага быту з'яўляецца тое, што мы ж любім тэатр, любім, каб нас уводзілі ў зман, а няраз прагнем, каб знялі з нас ярмо адказнасці, пакуту свабоды. Бо ж надта чалавечай ёсць патрэба гульні, тэатру, штучнасці, мастацтва, мастацкай дзейнасці, літаратуры.

Справа ў тым, каб у гульні, у тэатры абавязвалі ясныя правілы, каб гульцы трымаліся правіл гульні. Незалежна ад таго, мабыць кожны з нас у спрыяльных акалічнасцях пераўтворыцца ў рыгарыста-аўтарытарыста і зажадае падпаліць усе тэатральныя гмахі.

Што ж яшчэ можна было б дадаць; хіба тое, што творчасць, мастацкая творчасць неабавязкова мусіць быць сінонімам трагедыі, смяротнай сур'ёзнасці. Сумленнасць мастацкага твора гэта не чытанне маралі, надзьмутае прапаведаванне казаняў і навук. Хоць кружаць сярод нас тыя, хто ахвотна прымяняе мастацтва як сродак агітацыі і прапаганды. Добрае мастацтва, добрая літаратура гэта таксама інтэлігентная забава. Слушна заўважыў Фрыдрых Ніцшэ: сапраўднае мастацтва аздараўляе, не навучае.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

„Сацыялістычны" турызм

Сённяшняя беларуская дзяржава не перастае здзіўляць сваёй сістэмай „асаблівага развіцця". Узяць хоць бы сферу турызму. З аднаго боку ўсяляк дэкларуецца яго падтрымка, з іншага — дзейнічаюць абсурдныя пастановы і законы. Прыкладам, прыгранічныя тэрыторыі, прылеглыя да суседніх дзяржаў — Літвы, Польшчы, Украіны, пераўтвораны ў так званыя „памежныя зоны", заехаць у якія без адмысловага дазволу забаронена. Нават у часы СССР абмежавання на ўезд на гэтыя тэрыторыі не было. А зараз жыхар Гродна права заехаць, скажам, у Астравец, не мае. Праўда, пэўныя зрухі адбываюцца. Колькі месяцаў таму грыф „памежная зона" быў зняты з Сапоцкіна і яшчэ трынаццаці вёсак у раёне Аўгустоўскага канала. А то раней прасцей было паглядзець гэты помнік гідратэхнічнай думкі, заехаўшы ў Польшчу.

Дзяржаўная палітыка выразна скіравана на знішчэнне дробнага і сярэдняга бізнесу, без пашырання якога развіццё агратурызму немагчыма зусім. У нашых жа сённяшніх рэаліях даходзіць да нонсенсу, калі ім займаюцца выключна дзяржаўныя структуры. Вось і маем на ўсю Гродзеншчыну 5-7 агратурыстычных гаспадарак, хоць ахвотных займацца гэтым — многія дзесяткі актыўных людзей. Але пры такім драконаўскім заканадаўстве ім застаецца адкласці рэалізацыю сваіх мараў на далёкае заўтра.

Днямі прыйшла афіцыйная інфармацыя, што міністэрства ажно 22 турыстычныя фірмы пазбавіла рэгістрацыі і адпаведна легальнай дзейнасці, яшчэ 43 маюць афіцыйнае папярэджанне і апынуліся пад пагрозай закрыцця. Спытаеце, за што? А за тое, што не выконваюць спушчаны зверху план па колькасці прывезеных у Беларусь замежных турыстаў. Напэўна, гэта і ёсць „рынкавы сацыялізм" — ты рэгіструеш справу, а табе ўказваюць і загадваюць чым займацца. І куды гэтых турыстаў везці? На ўсё Гродна, прыкладам, толькі чатыры дзяржаўныя гатэлі і адзін прыватны. За апошнія 10 год у такім вялізным горадзе паўстаў толькі адзін прыватны гатэль, а адзін дзяржаўны зліквідавалі. Так што засяліцца без папярэдняга рэзервавання нумара часам вельмі складана. А калі гэта ўдаецца, то замежніка чакае шмат „атракцый". Ён пачынае вар'яцець, калі бачыць у прыбіральні не рулон, а скручаную палоску адмеранай (!) туалетнай паперы. Альбо, калі адзін ліфт ездзіць толькі да 7 паверха, а суседні на 8 і 14 паверхі. Альбо калі ў гатэлі няма дзе паснедаць. Альбо калі купальня знаходзіцца на калідоры і за карыстанне ёю трэба плаціць дадаткова (!). Безумоўна, так не ўсюды, але падобныя прыклады сустракаюцца часта. А кошты гатэляў для замежніка ўдвая, а то і ўтрая (як у Ваўкавыску) перавышаюць аплату для грамадзян Беларусі. Днямі, праўда, прайшла інфармацыя, што нібыта з 1 траўня 2007 года цэны гатэльных паслуг стануць аднолькавымі для ўсіх. Пытанне, чаму не з 1 лістапада 2006 года або не з заўтрашняга дня? Адказ, мяркую, просты. Параўнанне коштаў у варунках „рынкавага сацыялізму" будзе азначаць іх павышэнне для сваіх грамадзян. Таму непапулярную меру лепш адкласці на потым.

Знешнепалітычны імідж Беларусі сёння такі, што заходнія інвестары не спяшаюцца ўкладаць свой капітал у развіццё беларускай эканомікі ў цэлым і ў развіццё турызму ў прыватнасці. Апошнім часам актыўна рэстаўруецца архітэктурная спадчына Беларусі, але наяўнасць толькі цікавага аб'екта наведвання не прывабіць масавага турыста. Для гэтага патрэбная ўстойлівая сістэма развітай інфраструктуры і разнастайных паслуг, якой сёння няма. Найперш мусіць усталёўвацца вольны рынак, які сам будзе адказваць на патрэбы турыста.

Унутраны ж турызм істотна зніжаны з прычыны браку ў людзей вольнага часу і сродкаў на адпачынак. Людзі, якія маюць значныя прыбыткі, аддаюць перавагу больш дарагому і камфортнаму адпачынку ў замежных дзяржавах. Ды і людзі з сярэднімі заробкамі пры нагодзе стараюцца з'ехаць хоць куды — у блізкае замежжа, каб крыху адпачыць ад „саўковасці", якая ім абрыдла.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што сённяшняя беларуская дзяржава ўжо зразумела, што на турызме можна няблага зарабляць, але яна яшчэ не можа ці не хоча ўцяміць, што „рынкавы сацыялізм" — гэта тупіковы шлях.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

[1 ☞працяг]

польска-беларуская камісія па справах падручнікаў.

У час пасяджэння была звернута ўвага таксама на недахоп падручніка-сшытка для дашкольнікаў і ўрэшце ўласнага лемантара; да гэтай пары выкарыстоўваецца выдадзены на Беларусі „Буквар".

— На школы з беларускай мовай павінны быць павялічаны датацыі, м.інш. таму, што дзейнічаюць яны ў Польшчы „Б", — з гэтым былі згодны ўдзельнікі дыскусіі.

Пятро Божка, бельскі віцэ-староста, дадаў:

— На ўсходзе кошты ўтрымання школ большыя, чым на захадзе, хоць бы з увагі на клімат. Больш тут выдаем на ацяпленне, на электраток. Здаецца, гэтага не відаць з Варшавы.

Дэпутат Чыквін заклікаў бурмістраў і старостаў, каб прадставілі кошты ўтрымання школ і параўналі іх з атрымлівамымі субвенцыямі.

Андрэй Сцепанюк, дырэктар Бельскага белліцэя, звярнуў увагу камісіі і прадстаўнікоў міністэрстваў на абавязваючую г.зв. „падвойную дэкларатыўнасць" (абавязак вывучэння беларускай мовы запісаны ў статуце школ і дадаткова патрабуюцца пісьмовыя заявы ад бацькоў дзяцей, якія хочуць тут вучыцца):

— А што будзе, калі моладзь не захоча вывучаць беларускую мову, а схоча вучыцца ў гэтым ліцэі? Ці маем мы парушаць статут?

Незадоўга да заканчэння пасяджэння ў кулуарах дырэктар бельскай „тройкі" Васіль Ляшчынскі прызнаўся журналістам:

— Важна, каб члены камісіі і прадстаўнікі адпаведных міністэрстваў па вопыце зведалі, якім паветрам дыхае беларуская меншасць. Хай пабачаць, але хай і паразмаўляюць на нармальнай мове аб канкрэтах. Такія пасяджэнні нічога не прыносяць. Маюць яны больш дыпламатычны характар. Толькі коўзаемся па праблемах. Бывалі ў нашай школе розныя і камісіі, і міністры, ды я не памятаю, каб штосьці ад іхняга візіту ў нас змянілася.

Пры нагодзе пытанняў, звязаных з БГКТ, дырэктар Данута Главацка-Мазур, на здзіў беларускаму асяроддзю, заявіла:

— На 2007 г. заявы на ўсе заданні БГКТ, якія рэалізаваліся дагэтуль таварыствам, разам з конкурсамі для дзяцей і моладзі, падало Таварыства беларускай культуры. Мяркуючы па складзе ўлад гэтага таварыства, будзе гэта працягам таго, што дагэтуль рабіла БГКТ.

Як мы неафіцыйна даведаліся, ТБК было зарэгістравана 5 верасня, значыць, дзесяць дзён да канца тэрміну падачы ў МУСіА заяў на датацыі на наступны год. Новае таварыства ачоліла Гражына Валкавыцкая — кіраўнік гурту „Лучына". Яе намеснікам стаў Ян Сычэўскі. Заявы ТБК ужо разглядаюцца ў міністэрстве. Як сказала „Ніве" дырэктар Главацка-Мазур, персанальны склад новазаснаванай арганізацыі не будзе мець уплыву на рашэнні дэпартамента ў справе датацый для ТБК. Аднак, у размове з „Кур'ерам паранным" яе кіраўнік, віцэ-міністр Яраслаў Зялінскі, заявіў:

— Калі заснаванне згуртавання было толькі фармальнасцю, а кіраванне не зменіцца, то блага ўсё гэта бачу. Гэта не добры ход, і ставіць датацыі для новай арганізацыі пад сумнівам.

Аб бурлівай сустрэчы членаў камісіі і міністэрстваў, перш за ўсё з прадстаўнікамі і прыхільнікамі БГКТ, у Гайнаўцы ды м.інш. аб візіце ў школе іканапісання айца Лявонція Тафілюка, якая апынулася пад пагрозай ліквідацыі — у наступным нумары „Нівы".

Тэкст і фота Раіна СТЭФАНЧУК

З Бельскай кааліцыяй

Бельская кааліцыя, якую зараз састаўляюць Беларускі выбарчы камітэт, прадстаўнікі Саюза ўкраінцаў Падляшша і незалежныя кандыдаты, можа пахваліцца звыш дзесяцігадовай традыцыяй, поспехамі ў ранейшых выбарах і ў самаўрадавай дзейнасці горада Бельска-Падляшскага і Бельскага павета. Кандыдат ад Беларускага выбарчага камітэта Андрэй Сцепанюк восем гадоў правіў у Бельску, а іншы прадстаўнік гэтага камітэта Пётр Божка зараз з'яўляецца на-

Кандыдат на бурмістра Бельска-Падляшскага Пётр Божка

меснікам старасты Бельскага павета. Выбарчы камітэт выбаршчыкаў Бельская кааліцыя як першы быў зарэгістраваны ў павеце і яго кандыдаты ідуць на самаўрадавыя выбары з надзеяй на высокую падтрымку жыхароў Бельшчыны.

— Бельская кааліцыя існуе ўжо 12 гадоў. Спачатку састаўлялі яе Беларускі выбарчы камітэт, Саюз украінцаў Падляшша, Унія працы і партыя, якой спадкаемцам зараз з'яўляецца СЛД. Дзякуючы гэтай кааліцыі мы на працягу 8 гадоў перамагалі на выбарах і трымалі ўладу ў горадзе. У 2002 годзе з-за асаблівай актыўнасці былых лідэраў бельскай СЛД, якія хацелі разбіць Бельскую кааліцыю, дайшло да выступлення з яе СЛД і Уніі працы. Аднак кааліцыя пратрымалася і існуе па сённяшні дзень, — успамінае шматгадовы лідэр БК і сённяшні яе старшыня Андрэй Сцепанюк. — Зараз нас вельмі здзіўляюць непраўдзівыя выказванні прадстаўнікоў СЛД, якія сцвярджаюць, што яны хацелі і хочуць ісці з намі разам на выбары.

— Мы 8 гадоў правілі ў Бельску з перавагай нашых радных у Гарадской радзе і маглі ставіць на ўсе пасады сваіх людзей, але гэтага не рабілі. Наадварот, на пасады мы ставілі таксама палякаў, — кажа іншы шматгадовы лідэр Бельскай кааліцыі, былы старшыня Рады горада Бельска-Падляшскага Васіль Ляшчынскі, які зараз з'яўляецца намеснікам старшыні Рады Бельскага павета.

Па апошніх самаўрадавых выбарах Бельская кааліцыя ўвяла ў Гарадскую раду ажно 8 радных. Камітэт правых груповак здабыў на выбарах 7 мандатаў, а кааліцыя СЛД і УП дабілася 6 гарадскіх дэпутатаў.

— Мы не ідзем на выбары дзеля пасад, але будзем намагацца, каб уладу ў горадзе і павеце трымалі сумленныя людзі. Наша галоўная мэта — гэта праца ў напрамку развіцця Бельскай зямлі. Мы будзем дабівацца, каб нашы маладыя людзі хацелі вяртацца дамоў пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў і мелі да чаго вяртацца, — гаворыць кандыдат на раднага, дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк.

Зараз у Радзе Бельскага павета знаходзіцца 5 радных ад Бельскай кааліцыі, у тым ліку намеснік старшыні рады Васіль Ляшчынскі. Прадбачваецца, што на самаўрадавых выбарах са спіскаў Бельскай кааліцыі будуць балаціравацца кандыдаты на павятовых радных ад горада Бельска-Падляшскага ды Бельскай вясковай, Арлянскай, Боцькаўскай і, мабыць, Вышкаўскай гмін.

— Нашая стратэгія дзейнасці ў павеце — стварыць умовы, каб маладыя людзі не выязджалі з горада і вёсак, каб хацелі жыць на месцы і маглі тут зарабляць на ўтрыманне. Дзеля гэтага патрэбныя інвестыцыі, але трэба, каб на нашай зямлі гаспадарылі нашы людзі, а не прышэльцы з глыбі Польшчы — людзі, якія купляюць у нас вялікія палосы палёў, — гаворыць кандыдат на павятовага раднага, дырэктар бельскай „тройкі" Васіль Ляшчынскі, які з'яўляецца членам управы Бельскай кааліцыі. — Нам трэба памятаць аб сваім, сваёй нацыянальнасці, мове і веравызнанні.

Пётр Божка — кандыдат на бурмістра

— Людзі з Бельскай кааліцыі звярнуліся да мяне з прапановай, каб я стаў іх кандыдатам на бурмістра Бельска-Падляшскага. Рашыўся я прыняць прапанову, разлічваючы на дапамогу сур'ёзных людзей з кааліцыі. Думаю, што мой прафесійны вопыт і вопыт людзей Бельскай кааліцыі, у выпадку выбарчай перамогі, дазволяць добра кіраваць горадам, — кажа намеснік старасты Бельскага павета Пётр Божка.

Пётр Божка з'яўляецца выпускнікам Аддзялення журналістыкі і палітычных навук Варшаўскага універсітэта. У яго вялікі вопыт па адміністрацыйнай рабоце. Працуючы ў самаўрадах, перайшоў ён дарогу ад звычайнага чыноўніка, праз кіраўніка аддзялення, да намесніка старасты. У той час быў намеснікам дырэктара бельскай бальніцы. Жыве ён у Бельску разам з жонкай Даротай, лекарам-стаматолагам і сынам Аркадзіем, вучнем белгімназіі.

— Пачынаючы з магістрата, я хацеў бы павысіць якасць абслугі наведвальнікаў, якія прыходзяць да чыноўнікаў з рознымі справамі. Напэўна трэба стварыць асобнае месца абслугі наведвальнікаў, дзе бяльшчане атрымлівалі б комплексную інфармацыю аб месцы афармлення іх спраў, — заяўляе кандыдат на бурмістра Пётр Божка.

Мой суразмоўца хоча моцна ангажавацца дзеля паляпшэння, у супрацоўніцтве з паліцыяй, бяспекі ў горадзе. Звяртае таксама ўвагу на дарожныя інвестыцыі, якія вельмі хвалююць усіх гараджан.

— Трэба было б утрымаць тэмп дарожных работ, выкарыстоўваючы еўрасаюзныя сродкі. Аднак размяркоўваюцца яны ў Маршалкоўскай управе і многа будзе залежаць ад таго, колькі атрымаем грошай. Неабходна таксама мадэрнізаваць водаправодную і каналізацыйную інфраструктуру, — кажа Пётр Божка. — Хаця ў Бельскім павеце няма трагедыі наконт беспрацоўя, бо яно ў нас самае нізкае ў Падляшскім ваяводстве (9,2%), аднак мая мара — ісці ў напрамку стварэння добрых умоў для інвестараў, што стварыла б новыя месцы працы.

Мой субяседнік хоча стварыць адпачынкова-турыстычны цэнтр у наваколлі Замкавай горкі.

— Трэба было б пабудаваць там, між іншым, прыкрытую канцэртную пляцоўку, — гаворыць Пётр Божка. — Варта было б арганізаваць у Бельску агульнапольскае культурнае мерапрыемства, у якім прымалі б удзел прадстаўнікі розных нацыянальнасцей і гэта спрычынялася б да распаўсюджвання станоўчай інфармацыі пра горад. Трэба таксама лепш падрыхтаваць Бельск для прэзентацыі яго турыстам.

Кандыдат на бурмістра лічыць патрэбным большую дапамогу беларускай і іншым культурам на ўзроўні школ і Бельскага дома культуры.

— Варта працаваць у такім напрамку, каб людзі не саромеліся сваёй нацыянальнасці і каб Бельск быў месцам згоды для ўсіх насяляючых яго нацыянальнасцей, пашаны і ўзаемнага прызнання, — гаворыць Пётр Божка.

Лідэры Бельскай кааліцыі Васіль Ляшчынскі і Андрэй Сцепанюк

Пётр Сэльвясюк — кандыдат на войта Арлянскай гміны

— Можна многа добрага зрабіць у Арлянскай гміне і паказаць людзям, што можа быць лепш. Трэба ўтрымаць тое што тычыцца нацыянальных меншасцей, захаваць навучанне беларускай мовы, фінансаваць мастацкую і культурную дзейнасць у гміне, — кажа кандыдат на войта Пётр Сэльвясюк. — На многія мерапрыемствы і задачы можна атрымаць грошы з Еўрасаюза.

Пётр Сэльвясюк

Пётр Сэльвясюк — выпускнік Аддзялення кіравання і адміністрацыі Вармінска-Мазурскага універсітэта ў Ольштыне і Коледжа англійскай мовы ў Вялікабрытаніі. З працай самаўрадаў пазнаёміўся ў час стажыроўкі ў Канадзе. Жыве ў Бельску разам з жонкай Аннай і сынам Паўлам. Пётр Сэльвясюк працуе кіраўніком Бюро прымянення еўрасаюзных праектаў і мясцовага развіцця Павятовага староства ў Бельску-Падляшскім. Пералічвае ён еўрасаюзныя праграмы, з якіх можна атрымаць грошы на дарожныя, водаправодныя і каналізацыйныя інвестыцыі, а таксама на абсталяванне для пажарнай аховы і дадатковыя заняткі ў школе.

Юрый Ігнацюк — кандыдат на войта

Кандыдатам Бельскай кааліцыі на войта Бельскай гміны з'яўляецца Юрый Ігнацюк, які раней кіраваў гэтай гмінай на працягу трох тэрмінаў.

— Лічу я, што многа зрабілася за гэты час, калі я быў войтам. Зараз я прафесійна займаюся здабываннем еўрасаюзных сродкаў і хацеў бы гэта рабіць будучы войтам, бо надыходзіць час, калі з 2007 года па 2013 год зможам атрымаць многа грошай на гмінныя інвестыцыі, — кажа кандыдат на войта Бельскай гміны Юрый Ігнацюк.

Больш падрабязная інфармацыя аб кандыдатах Бельскай кааліцыі на бурмістра Бельска, гмінных войтаў, павятовых і гмінных радных, а таксама аб іх выбарчых праграмах знаходзіцца на спецыяльна заснаванай перад выбарамі вэб-старонцы: www.koalicjabielska.org (e-mail: info@koalicjabielska.org)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Белявічы

Цяпер гэта звыш 20 хутароў, рассыпаных у трох кіламетрах на ўсход ад Гарадка. Яны распаложаны паміж лесам Дубова на паўночным усходзе і лугамі ва ўрочышчы Стаі над рэчкаю Супраслю на паўднёвым захадзе. Пражывалі і пражываюць тут яшчэ некаторыя са старых сялянскіх родаў: Астравецкія, Аўсейчыкі, Вільдовічы, Госцікі, Дарашкевічы, Кахановічы, Лісоўскія, Марцінчыкі, Сяменчыкі, Тарасевічы, Трахімчыкі, Храноўскія.

Чалавечую дзейнасць у гэтых ваколіцах можна мераць шматлікімі стагоддзямі. Ужо каля X стагоддзя тут было даволі рухліва, асабліва калі ў 983 годзе кіеўскі князь Уладзімір Вялікі, а ў 1038 г. яго сын Яраслаў Мудры са сваімі дружынамі хадзілі супраць яцвягаў „і перамаглі і ўзялі зямлю іх".

У тыя часы для аховы ад набегаў гэтых ваяўнічых плямёнаў паўсталі крэпасці на паўночна-заходнім рубяжы Кіеўскай дзяржавы, ад узбярэжжа ракі Буг і да берагоў Нёмана, м.інш. Драгічын над Бугам, Бельск над Белай, Нарва над Нарвай, Гарадок над Супраслю, Гродна над Нёманам. Гарадок ужо ў той час адыгрываў важную ролю, бо стаяў якраз на старажытным шляху, які злучаў Гарадзенскае княства з Драгічынам. Вясною 1274 года на гэтым жа гасцінцы пад сцягамі літоўскага князя Тройдзеня ішлі гарадзенскія воі на Пабужжа і здабылі яму Драгічын.

Праз сто гадоў па гасцінцы ехалі крыжацкія рыцары і іх абозы. Яны ішлі на Ваўкавыск, Брэст і Бельск, браць у палон, грабіць і нішчыць. Было шмат такіх „рэйзаў". І ваколіцы гэтыя былі запусцелыя.

Жыццё пачало вяртацца сюды пры панаванні вялікага князя літоўскага Вітаўта, які наведваў любімы ім Драгічын. Ён пачаў пасяляць вялікакняжацкіх сялян і баярства ўздоўж рэк Ласоснай і Свіслачы, а таксама гасцінца з Гродна ў Драгічын.

Хто даў пачатак Белявічам — сяляне ці баяры — сёння цяжка ўстанавіць. Вядома, што суседнія з імі Меляшкі займелі назву ад Мялешкі Міхайлавіча, які меў тут свой маёнтак ужо ў 1505 годзе. Распаложанае побач Страшава ўзяло назву ад прозвішча свайго ўладальніка Страша, які ўпамінаецца ў актах ад 1567 года. Пад гэтым жа годам гаворыцца і пра сяло Белявічы (назва родавая ад назвы асабовай Бялевіч). Вёскі Белявічы, Меляшкі і Страшава належалі тады да Воўпенскай воласці. Магчыма, што ў Белявічах сядзелі вялікакняжацкія баяры путныя, абавязкам якіх было служыць пасыльнымі, ахоўваць вялікага князя ў час падарожжа, даглядаць дарогі. Гэтае сяло стаяла каля Свіслацкага гасцінца, які злучаў Гарадок са Свіслаччу. **(мох)**

На экспазіцыі сабраны амаль 1 200 ікон, сярод іх падарожныя іконы ў металічных акладках ды значкі і крыжы. Жамчужынай калекцыі — як адзначыла дырэкцыя музея — з'яўляецца унікальны комплекс XVI-вечных фрэскаў, уцалелых з разбуранай Благавешчанскай царквы...

Вокны ў іншы свет

Пасля больш дзесяці гадоў падрыхтовак і звыш сарака гадоў накоплівання збораў у Палацы архімандрытаў Супрасльскага манастыра Благавешчання Прасвятой Багародзіцы адкрылі найбольшы ў Польшчы музей ікон. — Гэта наша візітная картка не толькі ў Польшчы, але і ў сусветным маштабе, — сказаў у час яго адкрыцця мітрапаліт Сава. Ды падчас інаўгурацыі дзейнасці цэнтра не было электратоку і... патрона ўрачыстасці — міністра культуры.

Злева: біскуп Эдвард Азароўскі, мітрапаліт Сава, епіскап Міран, архімандрыт Гаўрыіл і дырэктар Падляшскага музея Анджэй Ляхоўскі

На ўрачыстым адкрыцці з'явіліся сотні чалавек. Мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава ўсміхнуўся:

— Столькі вас тут, як на прыхадскім свяце!

Прыбылі м.інш. і мясцовыя самаўрадаўцы і палітыкі (сярод іх і парламентарыі ды былы прэм'ер Владзімеж Цімашэвіч), праваслаўнае і каталіцкае духавенства, з праваслаўнымі епіскапамі Іакавам, Міронам і Грыгорыем ды выконваючым абавязкі каталіцкага беластоцкага мітрапаліта біскупам Эдвардам Азароўскім.

На экспазіцыі сабраны амаль 1 200 ікон, сярод іх падарожныя іконы ў металічных акладках ды значкі і крыжы. Жамчужынай калекцыі — як адзначыла дырэкцыя музея — з'яўляецца унікальны комплекс XVI-вечных фрэскаў, уцалелых з разбуранай Благавешчанскай царквы. Апынуліся на выставе м.інш. іконы пісаныя стараверамі з калекцыі сям'і Волкавых, перададзеныя Віктарам Волкавым, вядомым мастаком-фатографам. Адна з залаў распаложанага на двух паверхах музея прысвечана канону іконы на фоне раннехрысціянскага роспісу, перанесенага з супрасльскіх катакомбаў. Іншая зала сімвалізуе храм з усім літургічным годам. У іншых частках выставы можна сустрэцца са шматлікімі выявамі Багародзіцы і Хрыста. Ёсць таксама рэканструкцыя келлі іканапісца. У час адкрыцця музея гледачам спадарожнічаў пах палаючых свечак ля ікон ды кадзіла. На фоне гучэла ціхая царкоўная музыка. Ужо пасля ўключэння электратоку госці пакрочылі да чарговых, спецыяльна цьмяных залаў, адмыслова пабудаванымі калідорамі. Праз некалькі тыдняў маюць з'явіцца дадатковыя эфекты, якія яшчэ больш паўздзейнічаюць на ўсе пачуцці наведвальнікаў.

— Музей ужо цяпер упісваецца ў краявід музейнай справы не толькі польскай, але і еўрапейскай. Не толькі праз гістарычны, культурны кантэкст, месца і гэта, што паказваем, але і тое, у які спосаб хочам гэта паказаць, — пераконваў дырэктар Падляшскага музея Анджэй Ляхоўскі.

Супрасльскі музей з'яўляецца філіялам Падляшскага музея ў Беластоку, а курыруе яго ваяводскі самаўрад. Падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі прамаўляў:

— Дбаласць аб разнароднасць і захаванне культурнай тоеснасці былі і пэўна будуць нашым грамадзянскім абавязкам. Мы перакананы ў тым, што культурная, рэлігійная і нацыянальная разнароднасць нашага ваяводства гэта адна з найважнейшых нашых адметнасцей у маштабе краіны ды факт, які вырашае аб яго сіле і магчымасцях.

Крыху жартам, дадаў:

— Іконы гэтыя сабраны тут пры немалым высілку мытных службаў на ўсходняй мяжы.

І наканец заклікаў:

— Няхай гэтае месца мацуе нас у тым, што добрае, разумнае ды прыгожае.

Мітрапаліт Сава неадкладна прыгадаў, што ў 1982 г. у Палацы архімандрытаў на першым паверсе з тагачаснымі ваяводскімі беластоцкімі ды цэнтральныі ўладамі адбыўся — як гэта назваў — бой за Супрасль, значыць, адбудова храма Благавешчання Прасвятой Багародзіцы Дзевы Марыі:

— У выніку таго бою маем сённяшні дзень. Тады вось вырашана было аб перадачы руін супрасльскага храма Праваслаўнай царкве. Ад таго часу працягваецца адбудова гэтага асяродка.

Мітрапаліт адзначыў, што шматлікія іконы, якія апынуліся ў калекцыі, былі зганьбаваныя; сталі аб'ектам крадзяжу, трымалі іх у скляпах, кардонах, скрынях:

— Ікона — акно ў іншы свет. Бачым праз ікону другую меру нашага жыцця ў шырокім сэнсе, не толькі зямным, але і вечным.

Дадаў прытым:

— Гэты музей сёння не музей, а храм іконы. Адны прыйдуць сюды ўбачыць мастацкія, іканапісныя каштоўнасці, іншыя будуць ля гэтых ікон маліцца, а іншыя яшчэ, мабыць, і вернуцца да Бога.

Біскуп Эдвард Азароўскі:

— Ікона гэта не толькі рэлігійны знак, яна таксама запіс культуры. А культура, у сваю чаргу — вынік гэтых асноўных каштоўнасцей: праўды, дабра і красы. Іконы — па-над усімі падзеламі — і канфесійнымі, і нацыянальнымі, і над усімі іншымі. Гэта каштоўнасці супольныя кожнаму чалавеку. Можна сказаць, што ікона па сваёй натуры антрапалагічная, бо служыць чалавеку, і трэба так на яе глядзець.

Пры нагодзе мітрапаліт Сава падзякаў выконваючаму абавязкі беластоцкага мітрапаліта біскупу Азароўскаму, каб пасля адыходу архібіскупа Войцеха Зембы гэта ён кіраваў каталіцкай архіепархіяй. Пры нагодзе з вуснаў і мітрапаліта Савы, і біскупа Азароўскага прагучалі словы аб „узаемным добрым супрацоўніцтве не толькі па навуковай, але і міжчалавечнай лініі". Абодва яны — кіраўнікі універсітэцкіх кафедраў: адзін — каталіцкай, другі — праваслаўнай.

— Будзе яшчэ лепш, калі б быў супольны факультэт, — падкінуў ідэю мітрапаліт Сава.

Пасвячэнне музея здзейснілі ардынарый Беластоцка-Гданьскай епархіі епіскап Іакаў і біскуп Азароўскі. Дырэктар Ляхоўскі за заслугі ў карысць адкрыцця музея ўручыў шэрагу асоб-прыяцеляў адмысловыя металёвыя значкі-бэджы ды каля трыццаці спонсараў узнагародзіў граматамі. Крыстына Бенькоўская, Яніна Гасціловіч і Ева Врачынская, захавальніцы Падляшскага музея, ушанаваны былі міністрам ганаровымі званнямі „Заслужаны для нацыянальнай культуры".

Сродкі на заснаванне музея паходзілі з розных крыніц, м.інш. ад самаўрада і Міністэрства культуры. Агулам на музей выдадзеных было 4 мільёны злотых. За будаўнічымі працамі асабіста наглядаў супрасльскі архімандрыт Гаўрыіл, узнагароджаны міністрам культуры з нагоды ўрачыстасці медалём *Gloria Artis*. Ганаровы патранат над музеем узяў якраз міністр культуры і нацыянальнай спадчыны Казімеж Міхал Уяздоўскі. Аднак на ўрачыстасці ён не з'явіўся, выслаўшы адно прадстаўнікоў. У кулуарах гаварылася, што не хацеў ён пры такой нагодзе напароцца на сітуацыю, у якой прагучалі б пытанні да яго, звязаныя з „маральна-фінансавымі" завіраваннямі вакол супрасльскага Тэатра „Вершалін". Мітрапаліт Сава, здаецца, са шкадаваннем спаслаўся на непрысутнасць міністра-патрона:

— Я думаў, што прыбудзе спадар міністр Уяздоўскі. На жаль, няма яго сярод нас, а я хацеў яму падказаць, што падобны музей трэба заснаваць і ў Варшаве. У Супрасля своеасаблівы маштаб, ды сталіца — усё ж сталіца.

Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК

ФОТА-МАДЭЛЬ БЕЗ КАПЕЛЮША

— Ej, czarnulka! Zaczekaj!

Шурпаты голас пацаляў у маю спіну.

Я азірнулася.

Сярэдзінай вуліцы гнаўся вусаты дзядзька з зубамі наверсе, як у бабра.

— Я?

Вусата-зубасты на міг аслупянеў, пасля махнуў рукой і з капітуляцыяй у голасе прамовіў:

— Oj, to nie ta!

Я ішла вуліцай Міцкевіча і думала пра тое, што няма ў мяне шчасця. Вось-вось, здавалася, папаўся ўжо нейкі алень на маю фотаплёнку. А ён, як з'явіўся — так і знік.

Маё становішча аўтахтоны акрэслілі б адным словам:

— *Біда!*

* * *

Лепш не гаварыць, што прывяло мяне ў Нарву.

Ці сапраўды прафесійныя абавязкі?

Раней, значыць, цягам апошняй ночы, я праглынула раман Мірыка Грыкі „Апавяданні з-над Нарвы".

Раніцай шэф прапанаваў ехаць у глыбінку, каб высветліць тэму беспрацоўя.

— А, можа, у Нарву? — папрасілася я.

— Толькі не нарывайся! — кінуў замест блаславенства.

Для ўсіх, хто не чытаў М. Грыкі, належацца словы паяснення. Піша ён пра ахвяры дзікага капіталізму. Справа іншая: тыя беспрацоўныя — сімпатычныя дзядзькі.

Паводле „Апавяданняў" героі мелі валяцца ўжо на вуліцы, карацей, выседжваць у парку. Круглыя суткі, з перапынкам на грыбную экскурсію ў Макаўскую хваіну.

— *Дзісь погода, хоч ты ў рыэчку ліэзь*, — кажа нехта за плячыма ў аўтобусе.

Я не люблю красці чужыя размовы — лепш палетуценіць.

Далёка да Нарвы ў маёй галаве ўжо гатовы „фотарэпартаж".

Значыць, так: героі ўжо вярнуліся з грыбоў і сядзяць у парку. Зачапляюць пешаходаў. Мазгуюць — як тут раздабыць на чарніла. І вось перад імі з'яўлецца журналіст, значыць, я. Яны адкрываюцца. Пасля пазіруюць да здымкаў. Я раскашэлюся (толькі без перабольшвання — хопіць і дзесяць злотых). Нібыта за страту іх каштоўнага часу. Хоць, не — могуць пакрыўдзіцца! А гэтыя дзесяць злотых — такі ганарарчык ад фірмы. (Паводле М. Г. — хопіць на пяць пляшак пойла, у мясцовым слэнгу — *мазгаебкі*).

— To co dziś piszą w gazetach, to, panie, przechodzi ludzkie pojęcie, — чую ў сярэдзіне аўтобуса.

Брава! Мой віртуальны фотарэпартаж ужо як жывы.

Карацей, не хапае толькі здымкаў!

* * *

Не люблю віртуальшчыны.

Мой „фотарэпартаж" згарэў яшчэ да таго, як затармазілі колы аўтобуса.

У парку, замест маёй „тэмы", сядзеў малады бізнесовец з мабільнікам у правай руцэ (і левая рука была занятая — ён абкусваў ногці).

Ён, мой знаёмы.

— Ужо трэці дзень выглядаю сваіх новых гастарбайтэраў з Кялецкага. А яны, сама бачыш: у жмуркі

Фота Уладзіслава Завадскага

са мной гуляюць. Звоняць, што ўжо ў дарозе — а сама бачыш...

— Бачу, — кажу, хоць нікога не бачу.

Пытаюся проста з мосту:

— А сваіх то няма?

Тут, нечакана, абарвалася чорная хмара з градам паклёпаў у адрас беспрацоўных. Сорам паўтараць такое.

— Пакажы мне такога, то зафундую табе квіток у Нью-Йорк! — расхадзіўся Р.

Не ведаў ён, што ўбівае ў маё рэпарцёрскае сэрца іржавы цвік.

Мы развіталіся.

Я ішла і чамусьці, замест квітка ў Нью-Йорк, бачыла воўчы білет, якім палохаюць у канкурэнцыйным прадпрыемстве „Гонар".

У будынак сацыяльнай дапамогі я завалаклася з апушчанымі крыллямі.

— Ёсць у нас адзін беспрацоўны, — сказалі мне.

Вядома, ні прозвішча, ні адрасу я не дастала.

Мае крылы ледзь-ледзь узняліся.

Ужо за дзвярыма ўстановы ўхапіў мяне за палу плашча добры дзядзька:

— Гэта той, што з *вінзеня* нядаўна выйшаў, — шапнуў мне на вуха.

* * *

Майго беспрацоўнага не было ў хаце.

Я бадзялася па вузкіх вуліцах мястэчка з козлікам у гербе.

Наведала запушчаныя яўрэйскія могілкі ў Макаўскай хваіне.

Абкалядавала сем прадуктовых магазінаў.

Дарэмна.

Мае беспрацоўныя як пад зямлю праваліліся.

Рэальнасць кпіла з мяне — так, гэта былі кпіны. Куды ні глянь — работа, прадпрымальнасць. Хто крые хату чырвонай бляхай, хто падмятае панадворак...

На рэкламных стэндах ля парку — плакаты-запрашэнні на канцэрт маскоўскага балета „Бярозка".

Раз абмінуў мяне веласіпедыст з рэкламай прадпрыемства „Гонар" на выпрастанай спіне.

— І хто тут бедны? — дакараў мяне ўнутраны голас.

Нахабства раскошы атакавала з усіх бакоў.

Каля „Далікатэсаў" сакаталі тры цёткі абгружаныя прадуктамі. З паласатых пакетаў тырчэлі пруты каўбасы, рыльцы пляшак віна, бананы.

— Я пазваніла мужыку, каб падышоў сумку несці. А то накупляла столькі, што рукі млеюць, — сказала адна.

— *Ой, біда-біда!* — гудзеў насмешлівы голас у маім нутры...

Я заракалася, што ўжо ніколі не вазьму ў рукі кніжку Мірыка Грыкі.

Раптам на небе заззяла сонца.

— A może nam zrobisz zdjęcie? — ласкава спытаўся дзядзька, які, быццам месяц з-за хмары, выплыў з-за белай сцяны „Далікатэсаў".

Я кіўнула галавой у знак згоды.

Мой мадэль паклікаў да кампаніі калегу ў скураным капялюшыку.

Прысталі на фоне белага „мерседэса".

— Напэўна, гандлююць золатам, — падумала я.

— A sama może Żydóweczka? — заўсміхаўся мадэль.

У мяне не было ахвоты размаўляць з капіталістамі. Я толькі запісала адрас ды бяздарным, быццам у беспрацоўнага, крокам рушыла ў свой бок.

— Tylko nikomu nie pokazuje mojego zdjęcia, — кінуў на развітанне мадэль без капелюша.

— Чаму?

— Bo ja z *więźnia* niedawno wyszedł...

Ева СЦЕПАНЮК

У школах Бельска

Асветныя ўстановы Бельскага павета належна нарыхтаваны да навучальнага года 2006/2007, — паінфармаваў Анатоль Тымінскі, загадчык Бельскага староства. З увагі на дэмаграфічны спад у найбліжэйшым навучальным годзе трэба будзе падумаць пра новую сетку звышгімназічных школ.

Школы Бельскага павета могуць ганарыцца многімі дасягненнямі ў маштабе ваяводства і краіны, у рэйтынгах школ займаюць яны перадавыя пазіцыі.

Бельскае староства з'яўляецца вядучым органам для адзінаццаці асветных устаноў — яны ўсе, апрача Комплексу сельскагаспадарчых школ у Рудцы, у Бельску.

У бягучым навучальным годзе ў Бельскім белліцэі імя Браніслава Тарашкевіча вучыцца 447 вучняў ў 14 аддзелах. У першыя класы сёлета прыняты 130 вучняў, а школу пакінула 153 выпускнікоў. У ліцэі працуюць 34 настаўнікі і 7 адміністрацыйных і тэхнічных работнікаў. У мінулым школьным годзе ніхто не выйшаў на пенсію.

Сёлета ў Белліцэі да экзаменаў на атэстат сталасці прыступілі 154 асобы і з гэтага ліку тры не здалі, а гэта дае 98,052% паспяховасці і гэты паказчык найлепшы з усіх школ, падлеглых Бельскаму старостве. Іншыя школы, для прыкладу, дабіліся наступных паказчыкаў: I агульнаадукацыйны ліцэй — 97,22%, III агульнаадукацыйны ліцэй — 88,4%, III профільны ліцэй — 80,6%; апошнія школы дабіліся значна меншых паказчыкаў.

Камісія асветы пры Радзе павета парэкамендавала выдзеліць сродкі на капітальныя рамонты школ, асабліва ж на рамонт II агульнаадукацыйнага ліцэя імя Браніслава Тарашкевіча. У найбліжэйшым часе трэба будзе выдзеліць большыя сродкі і на рамонт іншых школ.

Камісія асветы запатрабавала таксама выдзялення буйнейшых сродкаў на пазашкольныя заняткі ва ўсіх падлеглых сабе школах. Зараз адбываюцца наступныя пазашкольныя заняткі:

— трэніроўкі школьных спартыўных гурткоў — 4 гадзіны ў тыдзень у кожнай школе;

— заняткі „Падляшскіх кукулак" у Комплексе школ н-р 4 — 24 гадзіны ў тыдзень;

— школьны аркестр у Комплексе школ н-р 1 — 27 гадзін у тыдзень;

— вакальны калектыў „Дзявочыя ноткі" ў Белліцэі — 3 гадзіны ў тыдзень;

— хор у Комплексе школ н-р 3 — 5 гадзін у тыдзень.

Апрача гэтага праводзіцца каля пяцідзесяці пазашкольных прадметных урокаў. Да таго ж ва ўсіх школах настаўнікі на грамадскіх пачатках вядуць дадатковыя заняткі падрыхтоўкі да матуры ў памеры каля 60 гадзін.

З верасня ўвайшлі пазаўрочныя заняткі па замежных мовах па дзве гадзіны на вучня, у якіх прыме ўдзел каля трохсот вучняў. Гэтыя заняткі прафінансуюць па палавіне павет і казна.

30 жніўня г.г. Рада Бельскага павета ўзбуйніла план расходаў і даходаў Бельскага староства з прызначэннем на рэалізацыю праекта „Рост турыстычнай атракцыйнасці Бельскага павета шляхам выдання буклета і ладжанне польска-беларускага семінара" ў рамках еўрасаюзнай праграмы суседства INTERREG. Вартасць праекта складзе 67,5 тысяч злотаў, дзе бюджэт унясе 6,75 тысяч, еўрасаюзныя сродкі — 50,625 тысяч і ўласныя сродкі павета — 10,125 тысяч злотаў.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 44 -

— У татавых вачах зноўку засеў Сум! — заўважыў Грак. — Як ты думаеш, Гражынка, ці не ад надвор'я ён у яго? Мне самому, як дзень меншае, ідзе на зіму, Сум залазіць у вочы...

Гражынка не мусіла занадта ўважліва прыглядацца свайму тату Колю, каб прыкмеціць Сум. Тата ўсё пазнавата вяртаўся з працы, маўчаў, бы не меў аб чым размаўляць з мамай і дачкой, альбо, наадварот, нахлынала на яго ахвота да крыху бесталковых размоў, якія, вядома, спыняў на паўслове.

— „Ты мяне зусім не разумееш" — так казаў тата маме, — уголас задумаўся Грак. — Як гэта трэба разумець?

— Праблемы нейкія ў іх паявіліся, ці што? — устрывожылася Гражынка. — Пра такія справы нам і ў школе гаворацъ, — калі няма паразумення ў сям'і, тады найбольш балюча дзецям! Трэба неяк памагчы. Што ты робіш, калі ў цябе паяўляецца Сум у вачах, Грак?

— Калі на мяне находзіць асенняя меланхолія... Тады я лячуся... травамі. У вазоне з альясам расце трава ад Суму. Я яе выполваю.

— А што за траўка тамака расце? Зямлю бабуля пад альяс прыносіла з агарода.

— Не ведаю! Нейкая дзікая траўка. Зялёненькая. О, як яна добра на мой Сум уздзейнічае...

— Дык што, мой тата на свае праблемы з Сумам мае чагосьці наядацца? Мо галушак з мясам ды са скварачкамі?

— Так хочацца зялёнага! Каб хоць паглядзець, сэрца суцешыць, — прахрыпеў Грак і зарагатаў-закаркаў, уявіўшы, што і тата перажоўвае пахучую траву з-пад альяса.

— Вітамінаў табе трэба, Грак, на тыя твае Сумы, — бабуля рашуча калупнула ў вазон пад альясам і вырвала развесяляльныя сцяблінкі. — Салату табе прынясу з крамы — які хочаш: маславы, кітайскі, ці, можа, італьянскую капустку?

— А мне на суцеху і будуць тыя бульбяныя галушкі з начынкай, ды пад скварачкамі! — засмяяўся тата, заглянуўшы пад покрыўку рондліка, дзе спачывалі вялізныя гарачыя, духмяныя шары.

— Эх, мужчыны, мужчыны... — уздыхнула бабуля. — У ваша сэрца сапраўды трапіць можна адно праз страўнік!

Міра ЛУКША

Дубічы ў Беластоку!

Госці ў „Ніве"

Завітала ў „Зорку" вясёлая кампанія! Госцікі з Дубіч-Царкоўных. Дзеці з першага, другога і трэцяга класаў Пачатковай школы. Разам з настаўніцамі: Нінай Добаш-Карпюк, Ірэнай Наўроцкай, Анэтай Філановіч і бібліятэкаркай Міраславай Семянюк-Мараўскай.

— Для нас гэта далёкае падарожжа, — кажуць сябры, — у адзін бок трэба патраціць за дзве гадзіны. Вядома, не пяшком, а на школьным аўтобусе.

Дубічы-Царкоўныя — прыпушчанская мясціна. Тут вучацца дзеткі і гімназісты з усёй гміны, іх усіх больш за сотню.

— А з якой вёскі ў вас найбольш дзяцей?

— З Ягаднік, — кажуць школьнікі.

Нашы госцікі заявілі, што з іх ваколіц выводзяцца славутыя беларусы: паэт Ян Чыквін, празаік Васіль Петручук і галоўны рэдактар „Нівы" Яўген Вапа. А на сустрэчу ў "Ніве" яны падрыхтавалі жартоўныя песні і вершыкі пра звяркоў. Спявалі і дэкламавалі трэцякласніцы Юстына Стэбрыла, Сільвія Рошчанка, Юстына Хадакоўская. Пасля спявалі адважныя першакласніцы. Хлопцы жартавалі, фокуснічалі...

Мы ад рання выглядалі дарагіх госцікаў. Ім падрыхтавалі аўтарскую сустрэчу з Мірай Лукшай, аўтаркай апавяданняў з кнігі „Дзяўчынка і хмарка". Усе дзеці і настаўніцы атрымалі ў падарунку кніжку з аўтографам.

Спяваюць першакласніцы

— Кніжка з аўтографам гэта скарб, — падзякавала ад усёй кампаніі пані Міра Семянюк-Мараўская. Яна напомніла, што сучасныя дзеці не маюць нагоды пабачыць ды паслухаць „жыўцом" аўтараў. Проста, аўтарскія сустрэчы цяпер рэдкасць у нашых школах.

Сапраўды, многія не ведалі як успрыняць кніжны падарунак. Напрыклад, жулікаватыя хлопчыкі, калі выйшлі за дзверы рэдакцыі, сталі... лупцавацца „Дзяўчынкай і хмаркай" (па галовах!).

А што зрабілі мы з падарункам ад дубіцкіх школьнікаў? Зараз у „Ніве", на сцяне, красуецца каляровы букет-рэльеф. Дзяўчаты самі выканалі аздобу на занятках рукадзелля, якія вядуцца ў іх вясковай святліцы.

Традыцыйна ўжо мы сфатаграфаваліся на фоне „Нівы". Нашым сябрам пашанцавала надвор'е, у дзень іх экскурсіі — 2 кастрычніка 2006 года — панавала залатая, цёплая восень. У такі дзень, сапраўды, не хочацца сядзець за школьнай партай!

Тэкст і фота ЗОРКА

Міра Лукша дае аўтограф Міхасю Куптэлю

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!



Калі якія клопаты — вінаватая я!

Я, Бася Муха, вінаватая ў тым, што зрабіла і ў тым, чаго не зрабіла. Вакол мяне заўсёды многа сяброў, яны ведаюць, што калі здарыцца нейкая бяда, за ўсё адказная Бася Муха з другога „ф” класа.

Сёння я думала, што выйду сама з сябе...

У нашай гімназіі няма крамы. На школьныя абеды ў нас мала ахвотных, часта па талерцы шпацыруюць мурашкі. Усе пакупкі мы рабілі ў спадара Антося, які мае краму насупраць нашай школы. Гэта не спадабалася спадарыні Воўк, нашай дырэктар. Яна не толькі забараніла нам хадзіць у краму „TOSIEK-SHOP”, але і ўвяла рэжым. За кожную пабыўку ў краме нам пагражалі штрафныя балы.

На перапынках была выстаўленая варта. За намі сачылі настаўнікі і прыбіральшчыца, працаўнікі канцылярыі і самая спадарыня Воўк...

Сёння, у час доўгага перапынку, мы з Ганкай, Касяй і Соняй выбеглі на двор. На варце нікога не было. Мы перабеглі дарогу і шмыганулі ў краму. Мы не паспелі ўвапхнуць у кішэнь кока-колу і салодкія булачкі, бо Ганка пабачыла на сходах спадарыню Воўк. Яна спісвала хлапцоў, якія вярталіся ад Антося .

— І што цяпер? — спытала напалоханая Соня. — Я не хачу мець штрафных балаў.

— А думаеш, што я хачу? — агрызнулася ёй Кася.

— Ведаю! — крыкнула Ганка, — перачакаем тут да канца перапынку.

— Але, здаецца, — перарвала я, — спадарыня Воўк ідзе якраз у краму? Давайце схаваемся за лядоўняй!

Спадар Антось адобрыў нашу канспірацыю:

— Спакойная галава! — сказаў.

Увесь доўгі перапынак мы прасядзелі за лядоўняй, а калі пачулі званок і на сходах не было варты, мы ірвануліся на двор. У пэўны момант я пачула, што на маёй спіне ляжыць цяжкая рука. Ганкі, Соні і Касі не было. Я павярнула галаву і пабачыла твар спадарыні Воўк:

— Я бачу, што вучні не разумеюць, што ім гавораць, — сказала яна службовым тонам.

— Але я была такая галодная... — пачала я.

— Гэта твая праблема, — строга адказала дырэктар, — а другая, гэта такая, што маеш яшчэ 15 штрафных балаў. Мне мусова пагаварыць з тваімі бацькамі і выхавацелькай. Як цябе завуць?

Спачатку я хацела назваць фальшывае прозвішча, але падумала, што навару сабе яшчэ большых клопатаў.

— Я... я... — прызналася я — Бася Муха, з II „ф” класа.

— Ах — гэта ты! — прашаптала з уцехай дырэктар. — Можаш ісці ўжо на ўрок.

Спадарыня Воўк пайшла ў школу, а я ўсё стаяла на сходах і думала пра сваё дурное шчасце... Раптам каля мяне з'явіліся мае сяброўкі Ганка, Кася і Соня.

— Чаму ты не схавалася разам з намі?! — крыкнула Соня.

Я глядзела на дзяўчат і чакала іхных слоў паяснення:

— Уся гімназія ведае, што спадар Антось спецыяльна ставіць свой фургон перад крамай, каб у час *налёту* мы маглі прыхавацца!

Я хвалявалася і суцяшалася, бо пра фургон спадара Антося не ведала яшчэ спадарыня Воўк.

Тэкст:<Natasza 9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@tlen.pl>

Галерэя „Зоркі” (Беласток)

Эмілія Сэвастыянік

У гімназіі стала вывучаць беларускую мову. Эмільку мы сустракалі на дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова” і на творчым летніку „Я нарадзіўся тут”. Зараз, разам з сябрамі, яна ходзіць на заняткі беларускай мовы. Эмілька — ліцэістка, яна ходзіць у элітарны III ліцэй у Беластоку.

Якая сярэдняя ў яе на пасведчанні? Каб дастацца ў згаданы ліцэй, неабходна мець пасведчанне з бел-чырвонай палоскай.

Эміла ў матэматычна-геаграфічным класе.

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Ходзіць вожык вакол бочкі

Ходзіць вожык вакол бочкі —
Плот высокі бачаць вочкі.
Ходзіць вожык аж да поту,
Ды канца не бачыць плоту.

Ходзіць вожык аж да стомы,
Канец плоту невядомы?
Ходзіць вожык аж да болю,
Плот не скончыцца ніколі...

Адкрыў магазін

Сустрэлася пасля гадоў
Двух даўніх школьных сяброў.
— Што ў цябе добрага? — спытаў адзін.
— Адкрыў я ювелірны магазін.

— У які гэта спосаб, скажы мне спярша,
Калі ты заўсёды быў без граша?
Калі быў як „пагарэлы артыст?”
— Адкрыў я адмычкай, як спецыяліст.

Польска-беларуская крыжаванка № 42



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 38:

Суп, салата, самалёт, арабіна, школа, на, гак, явар, казка, акно, важны, вера, касцёр, кот. Шафа, гусак, парог, нос, малако, сабака, шалі, звер, лён, якар, тата, важак, на, дар, артыст.

Энцыклапедыя душы

Чарговая сустрэча, чарговая магчымасць пабачыцца з разумнай, дасведчанай асобай. Чарговы шанц пагаварыць з адукаваным чалавекам, які не мае ніякіх комплексаў. Рэдкае шчасце... Свята душы... Нагода таксама святочная — новае выданне кнігі айца Рыгора Сасны і матушкі Антаніны Троц-Сасны „Святыя месцы і цудоўныя іконы”.

Што гэтая кніга значыць для мяне? „Святыя месцы і цудоўныя іконы” — своеасаблівая энцыклапедыя, якая дазваляе зрабіць яшчэ адзін крок у сябе. Кажу „ў сябе”, бо мне, чалавеку, выхаванаму ў атэістычным грамадстве Савецкага Саюза, вельмі цяжка зразумець, паняць тое, у што верылі мае продкі. А зразумець іх — значыць знайсці сябе, адкрыць, аднавіць яшчэ адну старонку гісторыі гэтай зямлі, дзе мае карані, адкуль родам, зямлі, у якой спачываюць мае блізкія.

Чытаю кнігу і перад вачыма ўсплываюць знаёмыя з дзяцінства абразкі. Бачу прабабулю Варвару і прадзеда Антона, якія што нядзелю выбіраюцца „на горад”. Вяртаючыся дамоў заходзяць да нас. Пытаю дзе былі і чую адказ: „У царкве”. „А чаго туды хадзілі?” — „Богу памаліцца”. Не разумею, куды і навошта ходзяць. Бога ж няма. Так казала выхавацелька ў дзіцячым садку, так кажа настаўніца ў школе, а, значыць, так ёсць... Было...

Мая бабуля ў царкву не хадзіла, мама таксама выхавалася без веры ў Бога. Малітваў у хаце ніхто не чытаў, нас, дзяцей, гэтаму не вучыў. Не навучылі нас маліцца, не навучылі пакоры.

Маё пакаленне ведала, што рэлігія — опіум для народа, што святары задурваюць галовы неадукаваным людзям. Здаралася, у кампаніі равеснікаў сорамна было прызнацца, што нехта з маіх блізкіх верыць у казкі пра Бога... Цемната...

Зараз, з перспектывы гадоў, пасля шматлікіх назіранняў і разважанняў, з дня ў дзень штораз глыбей і вастрэй адчуваю трагедыю майго пакалення і пакалення маіх бацькоў. На іх і на нас абарвалася сувязь, сувязь веры, душы і сэрца.

Тое, у што верылі прадзеды, засталося недзе ў нерэчаісным, здавалася б, у выдуманым свеце, у свеце мінуўшчыны. Зараз адкрываю гэты свет для сябе нанова. Для сябе і таму, каб па меры магчымасці пазвязваць парванае павуцінне памяці і традыцый, каб мае дзеці не мелі за сабой той бездані, якую маю я.

Чым далей заглыбляюся ў чытанне, тым лепш (як мне здаецца) разумею тое, што мяне абмінула, што згубілася ў прастоўні гадоў і палітычных ладоў. Абмінула, згубілася, але, на шчасце, не знікла назаўсёды.

Прачытаная кніга вандруе на паліцу, але ведаю, што зазірну да яе яшчэ шмат разоў. Па тое, каб адшукаць веру прабабулі, каб адшукаць сябе. Каб пасля расказаць дзецям. Зраблю так, таму што неатрыманыя своечасова інфармацыі, веды і досведы папаўняю з кніг.

На жаль, мая вандроўка ў святыя месцы і да цудоўных ікон адбываецца розумам, а не вераю, не душою... Яшчэ пакуль не душою.

Наталля ГЕРАСІМЮК

Кніжка, якую варта прачытаць

На сустрэчу з аўтарамі нядаўна выдадзенай кніжкі „Святыя месцы і цудатворныя іконы” айцом Рыгорам Сасной і матушкай Антанінай Троц-Сасной 28 верасня прыйшлі ў Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы жыхары горада і навакольных гмін. Пасля прэзентацыі цікавых здымкаў і размовы пра кніжку адбылася дыскусія пра царкоўнае жыццё і захаванне тоеснасці беларусаў Беласточчыны.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна цікава распавялі пра святыя месцы і цудатворныя іконы

Бібліятэкарка Наталля Герасімюк, адкрываючы мерапрыемства, паінфармавала, што аўтарам першага выдання пра святыя месцы і цудатворныя іконы быў толькі айцец Рыгор Сасна. Зараз сааўтарам папоўненай новымі матэрыяламі кніжкі з'яўляецца матушка Антаніна Троц-Сасна, якая разам з бацюшкам расказалі сабраным пра прэзентаваныя на фатаграфіях іконы, цэрквы і святыя месцы. Госці спаткання звярталі ўвагу на каштоўнасці праваслаўя, якое ў мінулым было дамінуючым веравызнаннем на нашых землях.

— Я думаю, што маю кніжку можна назваць энцыклапедыяй духоўнага жыцця Беласточчыны, — заявіў айцец Рыгор Сасна. — Першае выданне разышлося поўнасцю і неабходна было перавыдаць кніжку другі раз. У ёй былі ўлічаны новыя прыходы і цэрквы, напрыклад, храмы ў Наройках, Гродзіску, ці Мілейчычах, дзе знаходзіцца ікона св. Варвары.

Трэба памятаць аб святых месцах

Аб'ёмістая (пад пяцьсот старонак), прыгожа пераплеценая і багата ілюстраваная фатаграфіямі кніжка падзеленая на дзве часткі. У першай частцы аўтары знаёмяць з 17 цудадзейнымі месцамі, сярод якіх частка распаложана побач крыніц з вадой.

— Нашы бацькі і дзяды бралі ваду ў святых месцах. Яна давала ім духоўныя сілы для пераадолення цяжкасцей, — тлумачыў айцец Рыгор Сасна.

Удзельнікі сустрэчы асаблівую ўвагу звярталі на святыні вакол Гайнаўкі, напрыклад, на Крыначку ці крыніцу паміж Курашавам і Лядамі з капліцай і крыжамі, якія прыносілі вернікі з малітвамі за хворых і патрабуючых Божай дапамогі. Аўтары кніжкі расказалі пра святыя месцы побач Градалёў, Кнарыд, Краснага Сяла, Пяценкі і іншых вёсак.

— У Ружаным Стоку, дзе зараз моляцца католікі, да 1915 года жыло і малілася каля 200 праваслаўных манашак, якіх перавялі з Гродна. Разгарнуліся там ткацтва, лячэнне зёлкамі, іканапісанне і рыбаводства. Пасля манашкі падаліся ў бежанства і забралі з сабой цудадзейную ікону Божай Маці. Зараз старая ікона знаходзіцца ў Ярмаліне пад Масквой, а ў Ружаным Стоку католікі моляцца да яе копіі, — расказалі айцец Рыгор і матушка Антаніна.

Аб цудадзейных іконах

У другой частцы выдання вядзецца расказ пра больш за трыццаць цудадзейных ікон. Сярод іх пераважную частку састаўляюць іконы Божай Маці. Аўтары кніжкі распавядаюць таксама пра іконы, напісаныя ў гонар вядомых святых угоднікаў.

— Мне асабліва блізкі прыход у Старым Корніне, дзе я стаў дыяканам і нейкі час служыў, — адзначыў айцец Рыгор, расказваючы пра тамашнюю цудатворную ікону Божай Маці, якая загінула ў час бежанства. Зараз у Старым Корніне асабліва шануецца ікона св.св. Якіма і Анны.

Многія іконы, вывезеныя ў час бежанства ў Расію, асталіся там.

— Дзмітрыеўская ікона з Сакоў аб'ехала Расію, была ў Яраслаўлі і вярнулася дамоў. Прыхаджане з Сакоў, якія выратаваліся ад чыгуначнай аварыі, лічылі, што іх збавіла ікона, — гаварыў айцец Рыгор, які ў час спаткання часта спасылаўся на перыяд бежанства, калі беларусы, уцякаючы перад немцамі, пакідалі свае дамы і забіралі з сабой у Расію царкоўныя святыні. — Нашыя людзі не пражылі большага няшчасця як бежанства.

У кніжцы прадстаўлены мясцовыя легенды і расказы найстарэйшых людзей пра аздараўляльную моц ікон. Айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна, рыхтуючы кніжку, многа працавалі ў архівах, звяраючы аповеды людзей з дакументамі. Некаторыя святыя месцы былі ўжо апісаны ў асобных публікацыях. Айцец Рыгор і матушка Антаніна публікуюць новыя інфармацыі наконт гэтых месцаў. Паказваюць таксама на няяснасці ў ранейшых паведамленнях, стараюцца высветліць супярэчнасці і сумненні.

— Гадышэўскую ікону ў 1928 годзе вярнулі з Расіі праваслаўным у Польшчы, але пасля патрабавалі аддаць яе Каталіцкаму касцёлу, які ў міжваенны перыяд лічыў сябе спадкаемцам Уніяцкай царквы, — сказала матушка Антаніна.

Праваслаўныя аставаліся беларусамі

Малады чалавек пытаў аўтараў, як павінны акрэсліць сваю нацыянальнасць людзі, якія жывуць вакол Гайнаўкі і якія не размаўляюць на мове набліжанай да літаратурнай беларускай мовы.

— Для нас найбольш падыходзіць старабеларуская мова, якая называецца таксама рускай мовай. На скарынаўскай старабеларускай мове было надрукавана Заблудаўскае евангелле, — гаварыў айцец Рыгор Сасна, звяртаючы ўвагу на нашы беларускія карані. Гаварыў ён таксама пра мешаныя сужонствы, якія найчасцей становяцца каталіцкімі і ў якіх занікае традыцыя гутаркі на беларускай мове.

— Як памрэ наша мова, не будзе нашага народа, — дабавіла матушка Антаніна.

Я думаю, што варта прачытаць кніжку пра святыя месцы і аздараўляльныя іконы. Выданне мае навуковы і адначасна папулярны характар і таму накіраванае яно да шырокага кола чытачоў. Асобы глыбока веруючыя ў Божую дапамогу будуць у кніжцы шукаць месцаў, якія хацелі б наведаць дзеля малітвы і просьбаў у час хвароб і жыццёвых выпрабаванняў. Выданне збудаванае на верагодных гістарычных крыніцах. Краязнаўцы могуць у кніжцы знайсці многа цікавай інфармацыі пра мінулае Беласточчыны, жыццё праваслаўных вернікаў, якія ад вякоў насялялі беларускія землі. Кніга можа прыцягнуць на Беласточчыну праваслаўных паломнікаў і турыстаў, якія цікавяцца месцамі з багатай гісторыяй.

Аляксей МАРОЗ

Карысная кніга

У чарговы раз сустрэўшыся з айцом Рыгорам Сасной з Рыбалаў не перастаю здзіўляцца ягонай працаздольнасці, эрудыцыі і інтэлігентнасці.

Ён, апрача сваіх непасрэдных абавязкаў, цесна звязаных з жыццём прыхаджан, знаходзіць час для творчасці. Творчасці не дзеля славы, а дзеля справы. Ягоны жыццёвы дэвіз сугучны з дэвізам былога святара Свята-Сімяонаўскага сабора ў Камянцы Льва Паеўскага: „Няхай напісаныя мною радкі не прападуць дарма. Пісаўшы іх, я не шукаў літаратурнай славы. Слава, якой мы па праву можам ганарыцца, — гэта мінулае шматвяковае жыццё нашых продкаў, якія наканавалі нам паважаць іх бессмяротныя наказы ў згодзе з Богам і Святой Царквою” (1894 г.).

Днямі ўбачыла свет чарговая манаграфія бацюшкі Рыгора і матушкі Антаніны „Święte miejsca i cudowne ikony”. Фаліянт складаецца з 480 друкаваных старонак і ўяўляе сабой працу, якая, грунтуючыся на гістарычных даведках, знаёміць чытача з цудадзейнымі мясцінамі Беласточчыны і з цудадзейнымі іконамі, што знаходзяцца ў мясцовых храмах.

Кніга напісана мовай, зразумелай кожнаму зацікаўленаму чытачу. Спадзяюся, што прыхільнікаў у яе будзе шмат, бо інфармацыя, якую яна ўтрымлівае, неабходная кожнаму, хто лічыць сябе патрыётам Айчыны.

Тамара ЛАЎРАНЧУК
Высокае — Гайнаўка

На ўсходняй сцяне Еўрасаюза

Намечваю пабачыць Мастаўляны. І зноў, як раней, калі я напраўляўся ў Зубры, злажу з аўтобуса ў Зубках і перасякаю чыгуначны пераезд. А за ім праз той тыдзень бачацца змены. З правага боку чуваць нейкі гул, які, зліваючыся, напамінае гудзенне майскіх жукоў. Мо з паўкіламетра ад жвіроўкі, дзе пад лесам канчаецца балаціна, відаць рух голля, якое работнікі шпарка махаюць у вялікія кучы; бліжэй дарогі відаць высечаныя асобныя кусты. Відаць, што тут адбываецца зачыстка вялікага балоцістага палетка дзеля выкаранення з яго лясных прымешак, каб не было сумнення, што гэта сельскагаспадарчае ўгоддзе. Гэтае меркаванне ўскосна пацвярджае і папружынаваны абшырны аблог з супрацьлеглага, левага боку шашы. Не вялікі сакрэт, што гэтыя гектары рыхтуюцца дзеля вырошчвання на іх еўрасаюзных сельскагаспадарчых даплат.

Дарога ў Мастаўляны зачапляе канец Свіслачан. У гародчыку побач адной хаты паказваецца жанчына з некаляровай газетай у руках... Удаецца мне завесці з ёю размову, а яна хутка ўстанаўлівае мае газетныя каардынаты. Крыху распытвае пра старэйшых ніўцаў, шкадуе, што не піша Мірановіч... На большую размову няма часу, бо ж і агарод, і іншыя турботы патрабуюць руплівай увагі гаспадыні.

Мастаўляны ад Свіслачан — што рукою падаць. Вёска распаложана на ўсходнім схіле высакаватага ўзгорка, які паката апускаецца да Свіслачы. На вяршыне ўзгорка, над вёскай, відаць беласценны будынак у засені дрэў. Брук у Мастаўлянах міралюбна суіснуе з кволай яшчэ зеленню, якой карані натужліва ўзрыхліваюць грунт чарговым пакаленням расліннасці.

На першым панадворку шпацыруе салідны мужчына ў шорціках, значыць, гэта цяперашні гараджанін, які ў вёсцы з'яўляецца толькі сезонна. Бо ж сапраўдны наш аўтахтон кароткіх нагавіц не апране, так як і аўтахтонка капелюша. На другім панадворку мужчына косіць траўку; заходжу да яго. Трава для трусоў, а пра сваю вёску рэкамендуе мне даведацца ў солтыса, які павінен быць дома, бо за паўтары гадзіны вяскоўцы спадзяюцца камбайна.

Зраўняўшыся з солтысавай хатай заўважаю пагранічнікаў, якія на машынах прабіраюцца праз траву ўздоўж Свіслачы. Кіруюся ў іх бок, бо тут дзяржаўная мяжа падыходзіць пад самую вёску і адсюль можна зблізу палюбавацца замежжам. Маладыя пагранічнікі пахваліліся мне, што ўжо здаўна назіраюць за мною; а я гэтага і не заўважаў. Інфармуюць мяне, што перад намі, паміж цяперашніх гранічных слупоў, калісь быў мост, падпоры ад якога яшчэ тырчаць з вады. Пагутарыўшы яшчэ крыху, адпраўляюцца на матацыкле і квадзе ў сваю дарогу, а я вяртаюся ў вёску.

Хата мастаўлянскага солтыса патанае ў зелені, бо апрача блізкіх яблынь з даху звісае балдахін вінаграду. Солтыса ўжо няма дома, паехаў у поле чакаць камбайна, хаця да дамоўленага яго прыезду астаецца больш гадзіны, бо ж селяніна рупіць, каб сабраць тэрмінова ўраджай. А надвор'е патраціла акурат сваю стабільнасць і ўсяго можна спадзявацца...

У солтыса і куры ходзяць па падворку, і свінчо рознасенсорна заяўляе пра сваю прысутнасць. Дарэчы, у Мастаўлянах зараз дзве кароўкі, адзін конь і шэсць трактароў. А пастаянных жыхароў будзе пад сорак душ; наймалодшаму будзе, бадай, пад шэсцьдзесят. Мясцовымі хатамі цікавяцца „варшавякі", але ніхто не хоча іх прадаваць. Вясковага водаправода ў Мастаўлянах няма, людзі індывідуальна заклалі ў хатах водаправоды. Толькі адзін вясковец уручную дастае ваду з калодзежа. Аўтобус публічнай камунікацыі сюды не заглядае, толькі па аўторках прыязджае гмінны аўтобус, на якім можна дабрацца ў Гарадок. А калі хто занядужае, то трэба па тэлефоне прасіць дапамогі.

Царква ў Мастаўлянах

У згаданым раней беласценным мураваным будынку калісь размяшчалася школа; ходзяць чуткі, што будынак нехта купіў. Дарожкай, што адыходзіць ад пакінутай у падобную старыну як і школа крамы, кіруюся ў бок колішняй асветнай установы. Яна вітае наведвальніка вельмі адкрыта: адкрыты ў ёй насцеж усе праёмы. А навакольныя дрэвы быццам на гэта адклікаюцца і, здаецца, неўзабаве завітаюць у класы.

Ад школы спускаюся ў бок царквы. Пры дарозе, што адыходзіць у Ялоўку, чыгунны крыж на каменным пастаменце, абгароджаны драўляным плотам. Побач праходзіць мужчына і я яго падпытваю пра гэты помнік мясцовай старыны. Паколькі няма на ім выразнай дыягналі, толькі на яе месцы даволі нейтральная аздоба, мяркую, што гэта каталіцкі крыж. Але мой субяседнік сцвярджае, што крыж праваслаўны. Бо ў самой вёсцы жылі амаль выключна праваслаўныя. Праўда, пасяліўся быў тут і католік, які прыехаў недзе з Беларусі, але ён хадзіў у мясцовую царкву, бо тут прыгожа спявалі. На маю заўвагу, што найбольш вядомы ўраджэнец Мастаўлян, Кастусь Каліноўскі, быў католікам, мой субяседнік адказаў, што Каліноўскі быў не з вёскі, але з маёнтка.

Даведваюся таксама, што дарога, якая прыходзіць у Мастаўляны з Ялоўкі і цяпер упіраецца ў вясковую вуліцу, раней перасякала яе і праз мост выходзіла на другі бераг Свіслачы, а далей у вёску Каласы, якая цяпер у Беларусі. Каля моста быў таксама вадзяны млын, а за млыном, на запасным русле Свіслачы, быў яшчэ адзін мост; у запасное русло кіравалі раку, калі праводзілі рамонт млына. Пад канец вайны адступаючыя немцы спалілі частку вёскі, каб не замінала ім у назіранні перапраў праціўніка і выкапалі на пакатым схіле акопы. Падмінавалі яны яшчэ мост і млын ды адступіліся ў свае засады. Пад'ехалі савецкія разведчыкі, сталі клікаць у сваіх падмогу, але іхняму камандаванню не надта спяшалася. Тады немцы зноў падступілі да моста і ўзарвалі яго разам з млыном. А саветы яшчэ захапілі двух немцаў, што не ўспелі ўцячы — адзін з іх быў снайперам на царкоўнай званіцы — і пабілі ў полі; мясцовыя людзі іх пахавалі, але магілкі не насыпалі і так тое месца пасля зацягнулі полем.

Школьны будынак у Мастаўлянах

Дарога з Мастаўлян у Ялоўку жвіровая. Да яе час ад часу падступае лес. Але наогул паабапал палі, на якіх або пожня, або пожня з пакосамі саломы, або збожжа, якое пачарнела, прамытае дажджамі. Але побач тае дарогі можна сустрэць і цалкам адметныя вялікія палявыя раздоллі, на якіх растуць вельмі цікавыя культуры. Вось з левага боку шашы буяніць чарнобыль на фоне пырніку. Калі зыходжу з дарогі бліжэй прыглянуцца гэтай расліннасці, заўважаю сярод пустазелля і густыя калівы кволага ячменю; дзе-нідзе той ячмень відаць лепш, чым згаданае пустазелле. З правага боку пераважае расліннасць карычневага колеру; гэта дыван перасохлага і пераспелага дзікага шчаўя. Але з гэтай карычніны дзе-нідзе выглядаюць і белыя кветачкі — грэчка. Відаць, быў тут дзікі аблог, які сталі ўзрыхляць і абсейваць не так для ўраджаю, як для сельскагаспадарчых даплат...

Два кіламетры да Ялоўкі расхадныя дарогі. Іду ў бок недалёкай вёскі Ганчары. Перад вёскай пасецца адзінокая кароўка. У першай з краю хаце відаць людзей, але не маю ўпэўненасці, ці яны там жывуць пастаянна. Чарговы панадворак жыве паўнакроўным, калі так можна назваць, жыццём, бо па ім шпацыруюць куры. На адным панадворку стаіць самаход. Чарговыя хаты пустыя, аброслыя бэзам. Толькі ў канцы вёскі абгароджаная дагледжаным плотам абноўленая хата, якая выглядае быць заселенай толькі ў летні час. Каля адной хаты расце гародніна, побач іншай да клуні прымыкае свежы касцёр дроў, але ніякіх гаспадароў тут не відаць. На апусцелых панадворках шмат яблынь з прывабнымі пладамі. Іх абступаюць бярозы і сосны. На байкаватым участку поля за вёскай карычнеюць высечаныя самасейныя сосны...

Вяртаюся на гаспадарны падворак, на ім гаспадыня і гаспадар. Ім з выгляду каля сямідзесяці. І гэта іхняя кароўка пасвіцца перад вёскай. Гаспадар раней быў солтысам. У геркаўскі час у Ганчарах было трыццаць чатыры хаты, а з Ганчароў і Кітурыкаў здавалі больш малака, чым з Ялоўкі. Маладыя людзі павыязджалі ў гарады, а старыя — на могілкі ў Ялоўцы. У Ганчарах апрача маіх суразмоўцаў жыве толькі ўдава са школьным дзіцём у першай хаце і ў мураванцы далей самотная жанчына, якая заперлася ў сваіх сценах і нікому чужому іх не адкрывае. Дзве хаты купілі „варшавякі"; у адной з іх летуе ўласнік з машынай і двума сабакамі...

У Ялоўку іду каля газанапорнай станцыі. За станцыяй, з абодвух бакоў асфальтоўкі байкаватыя ўчасткі свежа папружынаванага поля, з якога тырчаць сцяблiны паваленага пустазелля. І тут рыхтуецца грунт для вырошчвання еўрасаюзных даплат. А праз паўтары гадзіны нетаропкага майго шпацыру з Мастаўлян у Ялоўку па жвіроўцы не пракацілася ніводная машына.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

На шэрым фоне выяўлення пасярэдзіне месціцца нібыта аркуш паперы. Уверсе гэтага „аркуша” шырокая блакітная палоска, на якой някідкімі белымі літарамі пазначана — газета „Свабода”...

Газэта “Свабода” http://www.kraj.org

Газета „Свабода” — неад’емная частка беларускага адраджэння. І гэта абсалютна не залежыць ад часу, калі гэтае адраджэнне перажывала свой уздым ці заняпад. Пачатак XX стагоддзя стаў часам нараджэння „Свабоды”, гарбачоўская перабудова вярнула газету да жыцця, лукашэнкаўская ўлада выціснула яе за межы дасягальнасці для большай часткі беларускага насельніцтва. Сёння знайсці газету з такой назвай немагчыма не толькі ў кіёсках ці крамах, але і ў офісах арганізацый, якія лічаць сябе дэмакратычнай апазіцыяй. Усё гэта ўказвае на тое, што „Свабоды” няма. Але насамрэч гэта не так. Папросту яна даступна не кожнаму. Прытулкам для „Свабоды” пачатку XXI стагоддзя стаў Інтэрнэт. Менавіта дзякуючы сусветнаму павуцінню прыхільнік беларускага нацыянальнага руху можа наталіць сваю прагу да незалежнай інфармацыі, якая пададзена ў стылі і фармаце „Свабоды” 10-15-гадовай даўніны, калі ўсё ў Беларусі нібыта дыхала надзеяй і адраджэннем.

Адрас віртуальнай „Свабоды”: http://www.kraj.org. Сайт выглядае даволі сціпла. На шэрым фоне выяўлення пасярэдзіне месціцца нібыта аркуш паперы. Уверсе гэтага „аркуша” шырокая блакітная палоска, на якой някідкімі белымі літарамі пазначана — газета „Свабода”.

Выяўленне падзелена на дзве часткі. Левая, шырэйшая — своеасаблівая стужка навін, якія ў той жа час ёсць і пачаткам газетных артыкулаў. З правага боку выйсці на гэтыя артыкулы праз тэмы-рубрыкі сайта. Гэтых рубрык даволі многа, што ўказвае на даволі шырокі ахоп „Свабодай” розных бакоў беларускага палітычнага і грамадскага жыцця. Назвы „Палітыка”, „Беларусь і суседзі”, „Беларусь — Расія”, „Простая мова”, „Спорт” і „Эканоміка” нібыта самі распавядаюць пра змест іх матэрыялаў.

Праўда, пасля прагляду выйсцяў ствараецца ўражанне, што віртуальныя свабодаўцы не зусім уважліва паставіліся да іх. Так існуюць дзве старонкі „Ад рэдакцыі”. У адной з іх няма нічога, што б указвала на нейкі пункт погляду рэдакцыі „Свабоды” на якія-небудзь падзеі ці факты. Адтуль мы папросту трапляем на артыкулы ці меркаванні, змешчаныя таксама ў іншых рубрыках.

Другая старонка „Ад рэдакцыі”, у адрозненні ад вышэйзгаданай, ёсць свайго роду прэзентацыяй „Свабоды” і словам да чытачоў. «15 гадоў таму нарадзіўся Інтэрнэт. І адразу аўтарытарная ўлада пачала шукаць управу на яго, — распавядаюць інтэрнэт-свабодаўцы. — Пішуць, што ўрад РБ нядаўна закупіў у Кітаі „машыны для аўтаматычнай апрацоўкі” (ажно на 20 мільёнаў даляраў), каб кантраляваць сеціва і не дапускаць зьяўленьня ў ім словаў кшталту „Свабода”. Але ўсе гэтыя вынаходнікі забываюць, што свабода існуе ня ў тэкстах і не ў тэхнічных прыладах, а ў нашых з вамі галовах. Чым больш людзей будзе думаць і адчуваць сябе вольнымі, тым меней шанцаў у начальства нешта забараніць. Аб гэтым сьведчыць і досьвед газэты „Свабода”, якая адрадзілася ў вольным друку».

Адраджэнне „Свабоды” ў Інтэрнэце асабліва заўважна, калі выйсці на нумары, якія змешчаныя на сайце ў фармаце pdf. Калі „гартаеш” старонкі гэтай інтэрнэт-газеты на сваім маніторы, ствараецца ўражанне, што „Свабода” і дагэтуль існуе ў папяровым выглядзе.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Гэта ўжо другі такі поспех айчынных тэнісістак. Чатыры гады таму, выйграўшы фінальны матч у Чэхіі, аналагічнага поспеху дасягнулі Анастасія Якімава, Дар’я Кустава і Кацярына Дэгалевіч...

Беларусь, беларусы...

Кубак федэрацый у беларусак!

Беларускія юніёркі, перамогшы ў фінале зборную Расіі, заваявалі тэнісны Кубак федэрацый. Гэта ўжо другі такі поспех айчынных тэнісістак. Чатыры гады таму, выйграўшы фінальны матч у Чэхіі, аналагічнага поспеху дасягнулі Анастасія Якімава, Дар’я Кустава і Кацярына Дэгалевіч.

Зараз да пераможнага поспеху трэнер Эдуард Дубраў прывёў Ксенію Мілеўскую, Іму Богуш і Вікторыю Емельянаву. Турнір праходзіў у сталіцы Каталоніі — Барселоне на грунтовых кортах. Спярша адбыўся групавы спабор. Нашы дзяўчаты ў першым матчы з сухім лікам адолелі гаспадынь пляцоўкі — іспанак. Яшчэ зусім нядаўна імёны прадстаўніц гэтай краіны (Аранча Сантас, Канчыта Мартынес) грымелі на ўвесь свет, а зараз у пірэнейскім жаночым тэнісе, відаць, сур’ёзны крызіс. Пра гэта сведчыць той факт, што аніводная іспанка не ўваходзіць у 500 мацнейшых юніёрскага сусветнага рэйтынгу. Наша ж Ксенія Мілеўская займае ў гэтай класіфікацыі вельмі высокае 3-е месца, Іма Богуш — 165-е. У наступнай сустрэчы беларускі адолелі Японію — 2:1. Лік матча не мусіць уводзіць у ілюзію ўпартага змагання — лёс матча быў вызначаны пасля адзіночных сустрэч, парная ж стала простай фармальнасцю.

У трэцім туры зышліся прэтэндэнты на першае месца ў групе — Беларусь і ЗША. Нашы дзяўчаты саступалі пасля першай сустрэчы, але здолелі пераламаць хаду падзей і здабылі валявую вікторыю — 2:1. Далей надышоў паўфінал, дзе супернікам стала Славаччына. Богуш і Мілеўская, аддаўшы на дваіх толькі адзін сет, перамаглі — 2:0. Славачкі не выйшлі нават на фармальную парную гульню. Нарэшце ў фінале чакала сустрэча з больш рэйтынгавай расійскай дружынай. Трэба заўважыць, што сёлета беларускі ўжо двойчы саступалі сваім усходнім суседкам. І вось надышоў рэванш на самым прэстыжным юніёрскім турніры! Па ходзе матча нашы дзяўчаты віселі на валаску, прайграўшы першую адзіночную гульню, але потым узялі ініцыятыву ў свае рукі і адолелі апанентак — 2:1. Самы важкі ўнёсак у агульную перамогу зрабіла 16-гадовая Ксенія Мілеўская, якая гуляла ў пяці адзіночных сустрэчах і трох парных і ўсе выйграла. Ксенія, дарэчы, родная сястра футбаліста Арцёма Мілеўскага, які выступае за зборную Украіны. Належна дапамагла сваёй равесніцы і Іма Богуш, якая мела 50 адсоткаў поспеху. Трэцяя наша тэнісістка Вікторыя Емельянава на год маладзейшая і выконвала ролю рэзервовай.

Доўгі час тэніснаму свету была вядома толькі адна беларуска — Наташа Зверава, якая стала нават бронзавай прызёркай алімпійскіх гульняў. Зараз яна жыве і працуе ў Берліне. Потым з’явілася Вольга Барабаншчыкава, якая ўваходзіла колькі год у сотню лепшых, але ў вышэйшую эліту так і не прабілася. Зараз Вольга стала тэлевядучай, спрабуе свае сілы таксама ў поп-музыцы. Імкліва ўварвалася ў вышэйшы эшалон 17-гадовая Вікторыя Азаранка, якая ўжо ўваходзіць у сотку мацнейшых на свеце паводле дарослай класіфікацыі. Ёсць надзеі і падставы меркаваць, што яе імклівым шляхам пойдзе і Мілеўская, якая сёлета выйграла ўжо чатыры юніёрскія турніры.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Яшчэ аб археалагічным фэсце

10 верасня ў Збучы ў чацвёрты раз адбыўся вельмі ўдалы археалагічны фэст. Наглядаючы за сёлетнім мерапрыемствам, падумаў я: што прыцягвае людзей у гэтае магічнае месца, чаму яны так шматлюдна наведваюць гэтую імпрэзу? Ці толькі таму, што яна іншая чым шматлікія на Падляшшы беларускія і ўкраінскія фэсты? Што трэба рабіць, так утрымаць тую прыцягальнасць?

Вялікім козырам Збуча з’яўляецца само месца фэсту: аўтэнтычнае тысячагадовае гарадзішча і вельмі багатыя і цікавыя гістарычныя помнікі, якія знаходзяцца паблізу яго. Не ведаю, наколькі мясцовыя жыхары ўсведамляюць сабе, сярод якіх скарбаў мінуўшчыны яны жывуць і працуюць, але думаю, што матэрыяльныя сляды старажытнага асадніцтва станоўча ўздзейнічаць на іх. А гэта лічу самым важным: пасля трагедыі бежанства, пасля разгрому памешчыцкіх маёнткаў — натуральных захавальнікаў традыцыі і помнікаў мінулага, наша вёска становіцца штораз бяднейшай духова. Добра, што многія самадзейныя калектывы захоўваюць і пашыраюць пэўныя традыцыі, але штодзённае вясковае жыццё пазбаўленае таго, што калісьці складала сапраўднае духовае багацце і было свайго роду трамплінам ад утомнай манатоніі цяжкай штодзённай працы земляроба.

Археалагічныя фэсты — добрая нагода, каб прыпомніць тое багатае мінулае наваколля Збуча і пазнаёміць з ім мясцовае насельніцтва і турыстаў. Думаю, што варта ўзяцца за больш актыўнае прапагандаванне гэтых ведаў, а таксама за праверку іх узроўню, напрыклад, шляхам конкурсаў для сабранай на фэсце публікі, ці для моладзі ў навакольных школах.

У час фэсту паказваюцца даўнія спосабы працы, неіснуючыя ўжо заняткі колішняга насельніцтва. Гэта вельмі важная і неабходная частка мерапрыемства. Але ў параўнанні з першымі фэстамі скрачаецца колькасць гэтых прэзентацый і не з’яўляюцца яны ўжо такой атракцыяй. Тады можа трэба прымяніць іншыя, да гэтай пары не паказваныя, формы працы. Напрыклад, конкурсы ворыва сахой, уборкі збожжа сярпом, трачавання. Можна не ўводзіць дурных, прыдуманых спаборніцтваў тыпу кідкоў берэтам, абцугамі ці хамутом (хто калі бачыў селяніна, які кідае хамутом?). А вясковыя гаспадыні маглі б спаборнічаць у стаўлянні самавара (пэўна ў нашых вёсках захавалася яшчэ некалькі штук гэтага прыбора), ці прасаванні прасам з жалезнай душой. Зрэшты, арганізатары фэсту могуць прыдумаць іншыя віды спаборніцтваў.

Вялікім атракцыёнам былі выступленні рыцарскіх брацтваў. Але і іх форму неабходна ўдасканальваць. Напрыклад, можа гэта быць старажытны купецкі караван ці напад разбойнікаў, якія „рабуюць” грошы ў публікі на нейкую высакародную грамадскую мэту. Маглі б яны ўчыніць „напад”, напрыклад, на шматлікіх на ўсіх фэстах аматараў піва. Цікавым было б паказаць як жылі нашы продкі ў сярэднявеччы. Рыцары маглі б правесці конкурс на тэму колішняга ўзбраення, а галоўным прызам магла б быць... рэпліка старой шаблі, якая падняла б прыцягальнасць конкурсу і заахвоціла ўдзельнікаў падрыхтавацца да яго адпаведным чынам. Канешне, нельга гэтае зрабіць у адзін момант, але трэба імкнуцца ў гэтым напрамку, бо калі фэст застыне ў сваёй форме, можа хутка стаць нудным. Варта таксама падумаць пра плакаты аб мерапрыемстве ў турыстычных мясцовасцях — Белавежы, Мельніку і іншых. Турысты пераважна перамяшчаюцца на машынах, шукаюць атракцыёнаў і напэўна прыедуць у Збуч. Арганізатарам нельга абмяжоўвацца толькі да мясцовых СМІ, паколькі турысты звычайна чытаюць агульнапольскую прэсу і пэўна не слухаюць перадачу „Пад знакам Пагоні”.

А на канец некалькі крытычных заўваг. Канферансье пэўна не ведае, чаму нейкі Брэжнеў, калекцыянер узнагарод і тытулаў, не атрымаў вайсковага звання генералісімуса. А таму, што яму цяжка было вымавіць гэтае слова! Як жа ж можа весці археалагічны фэст чалавек, які не ўмее вымавіць слова „археалагічны”? І чаму ўсё мерапрыемства ведзена было на польскай мове? З-за прыезджых?! Яны пэўна ўзрадаваліся б, калі б пачулі аб’явы „паруску” — тады было б ім аб чым расказваць у сваіх Варшавах... Гуралі ці кашубы не прытрымоўваюцца польскай літаратурнай мовы, гутараць па-свойму — і ўсе гэта любяць, і нікому гэта не перашкаджае. Чаму мы самі робім усё, каб было інакш? Мы ж у сябе дома! Перад кім мы так моцна прыніжаемся? Перад чыноўнікамі, у 98 працэнтах якіх прозвішчы канчаюцца на -ук?

І ўрэшце, чаму гарцэрскі калектыў, які вядзе мясцовы праваслаўны святар, спявае толькі польскі рэпертуар? Ці гэтыя спяваючыя дзеці паходзяць з Мазоўша і Вялікапольскі, ці з навакольных беларускіх вёсак? Пісаў я ўжо аб гэтым два гады таму, але нічога не змянілася. Шкада.

Усе мае заўвагі прад’яўлены з адной мэтай: удасканальвання мерапрыемства — прыгожага, цікавага і неабходнага, за якое я шчыра ўдзячны арганізатарам.

Марк ЦЫБАРТ

Забытая Грузкая

Наведаў я Яна Бадаўца, печніка з Кляшчэль. Пазнаёміліся мы сем гадоў таму, калі мне печы ставіў. Хоць рамесніку восемдзесят другі год пайшоў, не пакідае ён сваей прафесіі. Ад кліентаў дзверы ў яго не зачыняюцца, бо гэта майстар на ўсе рукі (чытай: „Апошняя мая прафесія — пячнік", „Ніва" № 16 ад 18.04.1999 г.). Добрасумленны і спагадлівы старэча прапанаваў мне збудаваць адмысловую сушылку для грыбоў. Паслухаўся яго рады і не шкадую. Зараз маю дзе грыбы ды яблыкі сушыць. Пры гарбаце Ян Бадавец расказаў мне такую вось гісторыю.

— У Грузкой даўней была драўляная царква, а побач — могільнік. Пасля царкву перанеслі ў наваколле Дашоў і там зараз знаходзіцца прыход Косьна. У Грузкой ад могільніка засталіся адны каменныя помнікі. Ніхто не памятае, з якога часу яны паходзяць. У верасні 1939 года ў Нурцы, што каля Дубна, немцы арыштавалі двух польскіх настаўнікаў. Прывезлі іх да Грузкой, сказалі ім ісці за вёску, пад альшыну і там застрэлілі. Бачыў я як аднаго хавалі. Апрануты быў у спартыўны касцюм. Пахаваннем займаўся Бронак з Пятроўшчыны. Захутаў ён нябожчыка ў прасцірадла і на старым могільніку, дзе калісьці знаходзілася царква, пахаваў. Казалі, што пасля астанкі аднаго сям'я з Варшавы забрала. Другі на даўнейшым месцы застаўся. Пры камуне гміна ўвекавечыла месца пакуты — у Грузкой паставілі помнік з мемарыяльнай дошкай, які абвялі жывой агароджай. Магілай апекаваліся школьнікі з Нурца, у Дзень памерлых прыносілі кветкі і лампадкі. Зараз не ведаю, што там робіцца, бо ў Кляшчэлях жыву...

Аповед Яна Бадаўца так мяне зацікавіў, што рашыў я паехаць у Грузкую. Было гэта ў панядзелак, 11 верасня. Праваслаўная царква адзначала Галавасека. Падаўся я затым на ровары ў напрамку Дашоў. Паколькі ў Грузкой я ніколі не быў, таму ў Дашах прыйшлося распытваць пра дарогу.

Ян Бадавец

— Паедзеце проста асфальтоўкай, затым направа павярніце, — патлумачыў мужчына пры краме.

Я спадзяваўся, што на скрыжаванні будзе стаяць дарожны паказальнік, але не было, таксама як і каля Паўлова. Паехаў я далей. Калі я перасек граніцу Сямятыцкага павета, зарысаваліся Навасёлкі. Невялічкая вёска пуставала. Сустрэты ў канцы вёскі мужчына паказаў мне дарогу ў Грузкую.

— Як пад'едзеце да скрыжавання дарог, павярніце налева, бо на права дарога ў Паўлова будзе...

Помнік памардаваным настаўнікам

На канец выявілася, што я некалькі лішніх кіламетраў праехаў. Ад шашы Кляшчэлі — Сямятычы да Грузкой будзе два кіламетры нядрэннай жвіроўкі. Вуліца ў вёсцы брукаваная. І тут, як і ў Навасёлках, царыла цішыня. Жывой душы. Пасля пабачыў сужонства, якое запытаў пра старое царкоўніска і магілу памардаваных настаўнікаў. Ледзь я дацялепаўся там па пясчанай дарозе. Калі рабіў здымкі, падышоў да мяне мужчына, з якім спаткаўся я ў вёсцы.

— Хацеў я пабачыць, ці вы трапілі, — сказаў з усмешкай.

— А дзе магіла настаўнікаў? — пытаю.

Мужчына падаўся ў бок астраўка зарослага купінай хмызняку, але нічога там не ўбачыў.

— Тут павінна знаходзіцца, але няма, — заявіў.

Развітаўшыся са сваім субяседнікам, я падаўся дамоў. У Дашах спыніўся побач вясковай крамы і завёў гаворку пра падарожжа ў Грузкую. Калі я сказаў, што не знайшоў магілы настаўнікаў, тады падышоў да мяне Аркадзь Бартнічук:

— Магіла на сваім месцы знаходзіцца. Помніка ніхто не забраў. Сядайце ў аўтамабіль, падвязу...

За Дашамі павярнулі мы ўправа, на гравійку. Там таксама не было дарожнага паказальніка.

— З боку ад Пятроўшчыны заедзем, — патлумачыў шафёр. —Дарога лепшая.

Праўда была на баку Бартнічука. Ледзь прабіліся мы праз купіну хмызняку, сярод якога знаходзілася агароджаная магіла з мемарыяльнай дошкай. Чытаю надпіс: „Sebastian Orzechowski, Henryk Rudź; Nauczyciele SZ-P w Nurcu zamordowani przez hitlerowców 15.IX.1939 roku. Cześć ich pamięci!" Вярнуўшыся ў Дашы, я яшчэ нейкі час размаўляў з мужчынамі ля вясковай крамы. Распытваў пра царкву ў Грузкой ды цяперашнюю мураваную ў Косьнай. Ніхто з суразмоўцаў не змог даць змястоўнага адказу. Адно Міхась Рошчанка, пенсіянер-чыгуначнік, які ў Чаромсе працаваў у паравозным дэпо, параіў папытаць настаяцеля Рагачоўскага прыхода.

З Дашоў у Кляшчэлі падвёз мяне на аўтамашыне знаёмы электраманцёр. Далей пакарыстаўся я сваім роварам. Так закочылася маё падарожжа ў Грузкую, вёску, пра якую забыліся ўлады Кляшчэлеўскай гміны. Гэтым самым хачу падказаць мясцоваму самаўраду: задбайце пра дарожныя паказальнікі ў сваёй гміне, каб людзі не блудзілі, а перад усім пра магілу памардаваных настаўнікаў. Гэта ваш абавязак.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Каб памяць не загінула

Успамін пра вядомага ў Нарваўскай гміне Аляксандра САДОЎСКАГА, чалавека, які пакінуў пасля сябе след не толькі ў памяці дзяцей. Выдатны самавук: сталяр, разьбяр, музыка і жывапісец.

Аляксандр Садоўскі сам выканаў з ліпавага дрэва вялікі ківот для цудоўнай іконы Пакроў Божай Маці ў Пухлах. Гісторыя іконы сягае XVI стагоддзя. Аднаму хвораму чалавеку на месцы сённяшняй царквы, дзе раней расла вялікая ліпа, з'явілася ікона Божай Маці і чалавек выздаравеў. На тым жа самым месцы пабудавалі царкву (першы ўспамін з 1580 г.). Ікона памагала людзям, многія аздараўляліся, асабліва ў 1710, 1830 і 1855 гадах, калі на Падляшшы панавалі эпідэміі халеры і чумы. З XVII ст. датрываў яшчэ старабеларускі канты пра цудоўную ікону, які спяваюць мясцовыя жыхары.

Паводле слоў жонкі Аляксандра Садоўскага, Надзеі, аднойчы прыехаў да іх мужчына і спытаў ці Сашка (так яго называлі ў вёсцы) мог бы зрабіць ківот для іконы.

— Мой Сашка сказаў, што можа. Ужо слаўны ў вёсцы быў, памагаў у сталярцы ўсім, хто яго папрасіў. Той мужчына заказаў ківот (у вёсцы ківот называлі іканастасам) спецыяльна для Пухлаўскай іконы. Мы самі не думалі, што Саша ўмеў бы зрабіць такую своеасаблівую ахвяру для іконы. На кожнае свята ў Пухлы ён ездзіў на сваім матацыкле „Ява". У 1986 годзе я ў Пухлы з ім не паехала. Як вяртаўся са службы, то не даехаў дахаты. На пачатку вёскі, перад крыжамі ўпаў і памёр. Дадому прынеслі ўжо яго людзі...

Аляксандр Садоўскі нарадзіўся ў 1910 г. у Гародні, але тут, у Рыбаках, была яго радзіма. Ягоная маці паходзіла з Малешаў, што каля Бельска-Падляшскага. Бацька Сашы, як вярталіся на радзіму, памёр на тыф. На радзіме пачыналі ўсё з нуля. У Гародні Сашка закончыў 4 класы. Талент атрымаў ад Бога, усяго навучыўся сам, ён умеў нават печы ставіць. У цэлай Сашынай сям'і толькі ў яго былі такія творчыя здольнасці.

Саша з мамай прыйшлі да мяне ў сваты. Раней ён бачыў мяне ў школе ў Цімахах (куды мы разам хадзілі, толькі я была малодшая на 5 гадоў), закахаўся з першага позірку і сказаў, што я буду яго жонкай.

Аляксандр працаваў і ў лесе, і на гаспадарцы. Праца была цяжкая. Быў прыгожым і добрым чалавекам. У сваты ўзяў сваю маму, а хто яшчэ так рабіў? Мы пажаніліся, калі мне было 22 гады.

Ён быў вельмі таленавіты. Сам навучыўся сталярству, займаўся ім у клуні. Любіў таксама маляваць. З гадамі, калі ўжо цяжэй было яму працаваць, стаў маляваць карціны. Непрафесіянальныя (навучыўся сам па сабе), але прыгожыя. На выстаўцы ў Беластоку ў 1986 г. ён займеў першае месца, хаця ўзнагароды не пабачыў. Не было яго ўжо ў жывых.

Мой Сашка любіў музыку. Цудоўна іграў на „пэдалоўцы". Часта падыгрываў разам з дачкой Марыяй, якая іграла на баяне. Яны іграліі, а я спявала, голас у мяне быў чысты і прыгожы. Аляксандр быў таксама кіраўніком музычнага гурту, які іграў на забавах, вечарынах і вяселлях. Сярод іх быў і скрыпач, і барабаншчык, а ён сам іграў на „пэдалоўцы", якую дзесьці купіў. Гурт быў слаўны на ўсю ваколіцу. Калі не было грошай, Саша так зарабляў на хлеб. Спяваў народныя песні, часам сам складаў музыку. Я займалася дзяцьмі, па меры сваіх магчымасцей памагала мужу.

Цяжка жылося, але сумеў зрабіць ківот для іконы. Я ў яго пыталася (калі сядзеў па начах), навошта ты так мучышся? Ён мне нязменна адказваў, што хоча аставіць пасля сябе памяць. Пакроў Божай Маці гэта для нас асаблівае свята...

Саша ў час вайны быў у лагеры ў Мельніку. Цудам з яго ўцёк. Старэйшы сын, якому было тады тры гады, цэлы дзень гаварыў мне, што тата ідзе. Я не верыла. А вечарам Сашка сапраўды прыйшоў! Змучаны, худы, ледзь падобны на чалавека, якім быў раней. Што ён, бедны, перажыў! Не хачу ўспамінаць — адны нервы. Але я моцная, столькі бяды перажыла і яшчэ жыву. Відаць, так мне трэба, так Бог дае.

Рэзьбы і памяткі па Сашы паразбіралі дзеці. Ён быў вельмі таленавітым чалавекам, цяпер ужо такіх няма.

Анна ПЯТРОЎСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2007 r. upływa 5 grudnia 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1450 egz.

Суседскія былі

Небяспечны дзень

„Лепш бы я пайшоў зранку ў калгас на працу", — падумаў Пятро Місюкевіч, пасля таго як убачыў праз акно сваю жонку, якая з заклапочаным, як у курыцы квактухі, выглядам куляй ляцела да хаты. Пятро ў гэты момант гатовы быў пабажыцца, што яго другая палова, з якой ён у сварках і ўзаемных прэтэнзіях, што называецца душа ў душу пражыў дваццаць сем гадоў чатыры месяцы і дзве з паловай гадзіны, ускочыць у хату яўна не з пяшчотнымі словамі кахання.

— Чаго рассеўся, лабідуда, — запішчала тая яшчэ знадворку, нават не бачачы ў якой позе зараз знаходзіцца цела бацькі яе дзяцей. — Усе людцы як людцы, даўно на працы, цягнуць набытае ў хатку як мурашачкі, а табе яшчэ дзень не надышоў, — не супакойвалася яна ўжо ўскочыўшы ў хату.

— А сёння дзень цяжкі, — парыраваў яе нападкі Пятро. — Шаптуха, што каля Багданава жыве, казала, што сёння лепш з хаты не выходзіць. Небяспечна для здароўя і нават для жыцця.

— Хай бы яна гэта нашай свінні сказала, — жонка кінула такі гнеўны позірк на галоўнага ў сям'і, што той мала не самлеў. — Бо наша свіння на гукі паднялася, зараза. Паламала ўсю загародку, хутка дзверы ў хляве высадзіць. Калі не знайсці ёй кнура, то да вечара ўвесь хлеў разнясе.

— Ну то не бяда, — пачаў супакойвацца Пятро, уцяміўшы, што жончына злосць з-за свінні, а не з таго, што ён учора заседзеўся за пляшкай добрага першака ў мясцовай самагоншчыцы Аліны. — Свінні пару знайсці проста. Каго прывядзеш — той і добры. Што ні кабан — то і муж. Гэта не для вас, баб, што каго не падсунь, усякага зганьбіце. У Семярніках ёсць добры племянны кныр у Вярбіцкага. Зараз справу афармім.

Пятро пазычыў у суседа матацыкл з люлькай, разам з ім выцягнулі з хлява паказаўшую, што і яна мае нейкія правы на прыватнае жыццё свінню, увапхнулі яе ў люльку і моцна прывязалі. А каб не змясіла нагамі шлем, адзелі яго жывёліне на галаву.

Праз нейкі час Місюкевіч рушыў у дарогу. Свіння сядзела ціха. Не брыкалася. І нават шлем не спрабавала скінуць. Хіба таму, што такі спосаб перамяшчэння яна ўспрыняла за факт, што і яе сталі лічыць чалавекам. А можа проста ведала куды яе вязуць. У самак усякіх відаў на гэта своеасаблівы нюх і інтуіцыя, якія цалкам адсутнічаюць у іх тупагаловых самцоў.

Дарога была недалёкая і ніякіх клопатаў не павінна было ўзнікнуць. Але першая ж машына, яка ехала насустрач, на вачах Місюкевіча зляцела ў роў. Пятро хацеў спыніцца і памагчы. Але калі другая машына звярнула ўбок і рэзнулася ў першую, вырашыў, хай самі разбіраюцца, калі ездзіць не ўмеюць, на роўным месцы разбіліся. Праз нейкі час з дарогі сігануў у кусты сустрэчны матацыкл. А пасля яшчэ дзве машыны, адна за другой гакнуліся ў слуп і дрэва. „Трэба ехаць асцярожна, — падумалася Місюкевічу. — Вельмі небяспечны выдаецца дзень".

У гэты дзень інспектар ДАІ Іван Пракопчык быў у такой разгубленасці, якой не было за трыццаць год яго міліцэйскай службы. Калі на месцы першай аварыі збянтэжаныя шафёры расказалі, што насустрач ім ехаў нейкі вар'ят на матацыкле, і вёз у люльцы свінню ў шлеме, і з тае прычыны, заглядзеўшыся на гэтае дзіва, яны і з'ехалі з дарогі, той падумаў: „Чаго толькі людзі не прыдумаюць, каб атрымаць страхоўку і пазбегнуць адказнасці". Калі падрапаны, як пасля бойкі з дзеўкамі, матацыкліст пацвердзіў тое самае, міліцыянт западозрыў, што ў раёне з'явіўся новы гатунак самагону, які выклікае назаўтра ў розных людзей адзін і той жа глюкавы прывід. Ну а калі пабітыя ў сінія яблыкі два наступныя пацярпелыя настойвалі менавіта на гэтай версіі, капітан ДАІ насамрэч яўна ўбачыў перад сваімі вачамі заўтрашнія падзеі: як яго ганебна выганяюць з работы, калі на стол начальства ён пакладзе рапарт з апісаннем дарожна-транспартных аварый з удзелам свінні на матацыкле.

У такім задуменні ён рушыў на сваім матацыкле ў Ашмяны, з недаверам узіраючыся на люльку і разважаючы, як там можна размясціць свінню. А Пеця Місюкевіч ужо вяртаўся назад вельмі задаволены, што ўдалося ўсё, што планаваў, і вёз у люльцы таксама вельмі задаволеную свінню. Інспектар ДАІ вуглом вока заўважыў на дарозе нешта нязвыклае. Яго позірк міжволі ўпіўся ў свінню ў шлеме. Пракопчык аж падняўся ў поўны рост на ножках матацыкла, і, размінаючыся з нязвыклым удзельнікам дарожна-транспартнага руху, развярнуў тулава на 180 градусаў. А праз хвіліну яго матацыкл так рэзнуўся ў слуп, што аж люлька ад яго адляцела і яшчэ метраў дзесяць кацілася ў поле, стараючыся апярэдзіць міліцыянта, які, мацюкаючыся, рабіў тое ж самае.

— Адчыняй, старая, хлеў, хутка будуць парасяты — заязджаючы ў падворак такім ганаровым голасам заявіў Пятро, нібыта ў тым факце была заслуга яго, а не кныра.

— Ідзі, паеш, — адказала жонка, якая бліжэй да вечара заўсёды рабілася больш лагоднай. — Як дзень прайшоў?

— У мяне — дзякуй Богу. Але шаптуха мела рацыю. Сёння было вельмі небяспечна. Пакуль я ехаў, безліч аварый здарылася. Прама на маіх вачах. Нават наш інспектар разбіўся на матацыкле. Халера іх бяры, гэтых шаптух. Скуль яны ўсё ведаюць?

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Францішка Салезія.

1. правы прыток Волгі ў Калузе = 19 _ 1 _ 2 _;
2. паўсядзённае жыццё = 18 _ 13 _ 15 _;
3. пасля альфы = 3 _ 17 _ 12 _ 30 _;
4. трэк для веласіпедных гонак = 10 _ 32 _ 22 _ 23 _ 24 _ 16 _ 25 _ 44 _;
5. замазка для акон = 41 _ 45 _ 42 _;
6. расплаўленая маса ў глыбінях Зямлі = 33 _ 37 _ 36 _ 20 _ 21 _;
7. збожжавы злак з мяцёлкавым суквеццем (*Panicum*), з яго зерня залацістыя крупы = 38 _ 39 _ 35 _ 9 _ 40 _;
8. цвёрды коўкі сплаў жалеза з вуглародам = 4 _ 5 _ 6 _ 31 _ 8 _;
9. устаноўлены ўрачысты абрад = 7 _ 43 _ 27 _ 28 _ 14 _ 26 _ 34 _ 29 _ 11 _.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 36 нумара

Абух, акцыя, боль, вір, гусь, лебедзь, міліцыя, мода, немец, том, Тычына, хімія, Цвер, цунамі, цыган, юань.

Рашэнне:

Маладыя людзі хочуць быць вернымі і не могуць, старыя хацелі б быць нявернымі і таксама не могуць.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Марыі Харкевіч** са Старога Ляўкова і **Лявону Федаруку** з Рыбал.

15.10 – 21.10

Баран (21.03. — 19.04.) Жаданне пагнацца за двума зайцамі не заўжды завяршаецца поспехам. Таму не спяшайся і не старайся быць адразу ў двух месцах. Зважай на вуліцы. Добры час паправіць адносіны з блізкімі.

Бык (20.04. — 20.05.) Добры час падпісваць розныя дамовы. Нішто цябе не стрымае ад рэалізацыі мэт. 18.10. можаш павялічыць свае даходы. Не карміся адным шампанскім ды шакаладам!

Блізняты (21.05. — 21.06.) да 18.10. магчымыя фінансавыя страты. Разлічвай толькі на сябе. Асцерагайся канфліктаў і іншых экстрэмальных сітуацый, бо праўдападобна не зможаш устаяць. Старайся захаваць духовую раўнавагу. З 20.10. добра пойдуць усе экзамены, важныя размовы.

Рак (22.06. — 22.07.) Будзь вельмі асцярожны, асабліва за рулём. Да 23.10. збіраеш сілы для будучых актыўных дзеянняў. 16.10. могуць трапіцца большыя грошы. Цяжка вывалачы цябе з дому. Апранайся цёпла, асцерагайся вільгаці, бо хвароба можа ўдарыць адразу ў розныя месцы.

Леў (23.07. — 22.08.) Будзеш моцны, трывушчы, прадпрымальны. Пільнуйся, каб цябе не ашукалі. Не шалей на аўто ані нават на ровары! Рэдка паказвайся на вочы кіраўніцтву. Не займайся азартам — можаш выйграць, ды хутчэй усё страціш. Будзь ласкавы для свайго пазваночніка.

Дзева (23.08. — 22.09.) Прыслухоўвайся інтуіцыі. Не лаві зразу сарака сарок за хвост, бо магчымыя страты ў грашах. Кар'ера развіваецца пры сустрэчах, камандзіроўках, размовах. Будзь асцярожны з пітвом (таксама і алкаголем), воднымі працэдурамі.

Шалі (23.09. — 22.10.) 18-21.10. — час спрыяльны для наладжвання вельмі карысных знаёмстваў. Усё (да 23.10) вельмі вялікая ў цябе патрэба свабоды, што можа паўплываць на адносіны з партнёрам. 18.10. можа табе фартуна накапаць крыху больш у кашалёк.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Калі адчуеш, што ў табе кіпіць агрэсія, не стрымлівай яе ў нутры, бо можаш захварэць. Трымай за кулісамі сваю прафесійную актыўнасць. Поспехі на працы ў рэжысёраў, пісьменнікаў, лекараў, сакратароў, целаахоўнікаў і намеснікаў кіраўнікоў. А ў каханні — ва ўсіх!

Стралец (22.11. — 21.12.) Не асноўвай сваёй дзейнасці на ідэалізме і пачуццях. Бізнес сакрэтны, ды паспяховы. 16 і 18.10. трапіцца грош. Дома дух любові, павагі. Не прымяняй невядомых лякарстваў, не еж вострага і тлустага. Асцерагайся скразнякоў і скандалаў.

Казярог (22.12. — 19.01) 16-20.10. большая грашавітасць, прыхільнасць шэфа, поспехі на працы, шчасце ў каханні свабодным Казярогам. Прыбыткі — асабліва 19.10.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Да 18.10. пагражаюць непаразуменні з кіраўніцтвам. Варта наладзіць кантакты з замежнымі бізнесоўцамі, дабрачыннымі фондамі і культурнымі арганізацыямі. Не абівай парогаў паліклінікі — можа, у цябе толькі іпахондрыя?..

Рыбы (19.02. — 20.03.) Будзь асцярожны пры афармлянні дакументаў, пазбягай кантактаў з праваахоўнымі органамі і судовымі інстанцыямі. Можаш стаць ахвярай паскуднай інтрыгі або сваёй маной давесці да благой сітуацыі. Разлічвай на свайго Анёла-ахоўніка!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960


Якуб Колас ☞ III

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

Надзея Сахарчук ☞ IV

У ліку ганаровых гасцей канферэнцыі былі канфесійныя, дзяржаўныя і навуковыя іерархі. Вітаючы ўдзельнікаў канферэнцыі беластоцкі праваслаўны архірэй Іакаў прыгадаў, што Супрасльскі кодэкс паходзіў з Балканаў, а адным з першых выканаўцаў супрасльскіх фрэскаў быў Нектарый — праўдападобна сербскі манах з Афона...

ПАД БАЛКАНСКІМ УПЛЫВАМ

У днях 28 і 29 верасня г.г. адбылася ў Беластоку навуковая канферэнцыя на тэму „Праваслаўная царква на Балканах і ў Польшчы". Канферэнцыю ладзіла Кафедра гісторыі Цэнтральна-Усходняй Еўропы Беластоцкага універсітэта ў супрацоўніцтве з Афінскім універсітэтам і варшаўскай Хрысціянскай багаслоўскай акадэміяй.

У ліку ганаровых гасцей канферэнцыі былі канфесійныя, дзяржаўныя і навуковыя іерархі. Вітаючы ўдзельнікаў канферэнцыі беластоцкі праваслаўны архірэй Іакаў прыгадаў, што Супрасльскі кодэкс паходзіў з Балканаў, а адным з першых выканаўцаў супрасльскіх фрэскаў быў Нектарый — праўдападобна сербскі манах з Афона. Біскуп прафесар Эдвард Азароўскі, загадчык Кафедры каталіцкага багаслоўя Беластоцкага універсітэта, прыгадаў, што калі польскі князь Мешка хрысціўся ў 966 годзе, хрысціянства не было тады раз'яднана — у яго астаецца адна аснова, разышліся толькі вярхі, якія, магчыма, зыдуцца ў будучыні. Прарэктар Беластоцкага універсітэта Галіна Парафіяновіч і падляшскі ваявода Ян Дабжынскі пахвалілі наша старонне — ягоную красу і унікальную спецыфіку багатай разнароднасці.

Пра іншую разнароднасць расказаў прафесар Венецыянскага універсітэта Аляксандр Наумаў: хаця літургічная традыцыя прыходзіла да нас з такіх аўтарытэтных цэнтраў як Іерусалім, Канстанцінопаль ці Афон, то вялікая свабода рэлігійных абрадаў у Царкве стварыла буйны абрадавы каларыт. Было меркаванне, што ўвядзенне друку стала канцом тае разнароднасці, але нават жа друкаванае слова яго чытачы разбіралі па-свойму, у залежнасці ад мясцовых умоў. Напрыклад, у Візантыі на Куццю імператару і патрыярху вернікі спявалі „Многая лета", а ў Вялікім княстве Літоўскім, дзе такіх чыноў не было — не спявалі. У Пярэмышлі, у адной з кніг, дзе была мова пра віно ў літургічнай традыцыі, якое на нашай Поўначы было менш распаўсюджана чым на Балканах, нехта дапісаў на полі багаслоўскай кнігі: „І горилку пьем во славу Божию". І святыя былі іншыя, мясцовыя, а тыя з іншых, далёкіх епархій, былі менш вядомыя, напрыклад, у нашы календары трапілі лічаныя балканскія святыя за перапісчыкамі, якія спісвалі іх з балканскіх першакрыніц; былі гэта найчасцей грэчаская Параскева, балгарскі Іван ды сербскія Сава і Сімяон.

Найчасцей нашы перапісчыкі карысталіся ў сваёй працы сербскімі арыгіналамі; пра гэта сведчыць хаця б сходная з сербскай структура перапісваных у ВКЛ намаканонаў. Першая версія жыцій трох віленскіх мучанікаў (Іаана, Антонія і Яўстафія) была напісана сербамі. Іншыя, літаратурныя, мясцовыя тэксты тэматыкай, структурай і лексікай сходныя з сербскімі. Фігуры на супрасльскіх фрэсках падобныя, напрыклад, вопраткай, да тых, што ў Сербіі. І няма тут вялікага дзіва, бо першыя супрасльскія манахі з'явіліся не толькі з Кіева, але і з Балканаў.

Хаця некаторыя традыцыі разыходзіліся, аднак у Царкве былі людзі, якія клапаціліся пра адзіныя стандарты. Прыкладам можа быць кнігадрукаванне, дзе друкары ўводзілі грэчаскі шрыфт, каб на ім перадаць арыгінальныя словы, фразы ці цэлыя фрагменты багаслоўскай літаратуры. Як паведаміў прафесар Мікалай Нікалаеў з Пецярбурга, у ВКЛ грэчаскі шрыфт стаў уводзіць Іван Фёдараў; трапіў ён у друкарні Вільні, Магілёва, Еўя, Любчы. Магілёўскі друкар Спірыдон Собаль завёз грэчаскі шрыфт і ў Маскву.

Дбаць трэба было не толькі пра стандарты багаслоўскай літаратуры, але і пра стандарты паводзін свяшчэнскага саноўніцтва. З гэтай мэтай у 1580-х гадах наведаў Рэч Паспалітую канстанцінопальскі патрыярх Іерэмія II, які рашуча асуджаў сіманію і палігамію мясцовых святароў, заклікаў вернікаў да дабрачыннай дзейнасці; даклад пра гэта зачытаў а. Андрэй з Афінскага універсітэта.

Прафесар Дымітрыос Гоніс, таксама з Афін, гаварыў пра іншую цікавую падзею, пра гандаль у царкоўных вярхах, якога паслядоўнасці актуальныя і ў сённяшніх палітычна-канфесійных разборках: як на схіле XVII стагоддзя Кіеўская мітраполія перайшла з Канстанцінопаля ў падпарадкаванне Маскве. Маскоўскія паслы ў Порце падкупілі грашалюбнага патрыярха Дзіянісія, даўшы яму шэсцьсот залатых манет хабару і той, за выдуманай прычынай клопатаў у султанскай дзяржаве, згадзіўся на часовае падпарадкаванне Кіева Маскве. Асуджаў яго пазнейшы патрыярх Дасіфей, за неканапічнасць такога пераводу. Але тут уступілі ў сілу палітычныя дзяржаўныя разборкі: Турцыя ў той час ваявала з Рэччу Паспалітай і Аўстрыяй і ёй патрэбны быў саюзнік, якім спатрэбілася Масква. Улады Порты прыціснулі Дасіфея і той знайшоў выхад, якім абыходзіў паднятую ім жа самім неканапічнасць: менавіта спаслаўся на колішні прынцып патрыярха Фоція, каб царкоўныя змены прымяркоўваць да палітычных. А паколькі ўжо Кіеў „выбыў" з Рэчы Паспалітай у Масковію, дык Дасіфей пайшоў на ўступкі і адобрыў рашэнне Дзіянісія; такім чынам і Кіеўская мітраполія сыграла ролю своеасаблівага хабару.

Балканска-нашы дачыненні не абмяжоўваліся толькі да палітычнага гандлю; краналі яны і спраў чыста культурных. Асабліва цікавы даклад пра некаторыя сляды візантыйскай культуры ў польскім мастацтве зачытаў прафесар Афанасіос Сімоглу з Салонік. А візантыйская культура, нашчадкамі якой сталі культуры балканскіх народаў, як сказала іншая ўдзельніца канферэнцыі, увабрала ў сябе культурную спадчыну не толькі ранейшай эліністычнай культуры, але і дахрысціянскія здабыткі іншых культур Блізкага Усходу. Асабліва фрэскі ў вавельскай капліцы і ў люблінскім замку змяшчаюць кампазіцыйныя і дэталёвыя запазычанні з Арменіі, Эфіопіі і Сіная! Мастацкія элементы візантыйскага паходжання адкрыты таксама ў Сандоміры, Вісліцы, а нават у Гнезне!

Пра балканскія ўплывы ў храмабудаўніцтве расказала прафесар Інеса Слюнькова з Масквы. Да гэтага дадала яна цікавую заўвагу, што ў XVII стагоддзі ў Рэчы Паспалітай, якая тады адмаўляла падтрымкі Праваслаўнай царкве, у адсутнасць праваслаўнай іерархіі, было ўзведзена 44 манастыры, а ў той жа час у маскоўскай дзяржаве, якая афіцыйна пачала лічыць сябе апорай праваслаўя, паўстала іх толькі 30! Архітэктура тагачасных цэркваў у Кіеве, Чарнігаве, Магілёве ці Куцеіне нагадвала храмы Афін, Салуні (Салонік) ці Афона. І тыя храмы, што выраслі ў Падняпроўі, сталі штуршком для г.зв. „маскоўскага барока", а Куцеінскі манастыр побач Оршы стаў своеасаблівым рэлігійным арыенцірам для Масквы.

А тыя ўплывы не ўплывалі так самі па сабе: іх прыносілі за сабою канкрэтныя людзі. Наступ туркаў, а за ім наступ ісламу, выцясняў хрысціянскіх вернікаў з балканскіх краін у больш ім спрыяльныя месцы, на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага. Ды міграцыя адбывалася не толькі з поўдня на поўнач, але і ў адваротным напрамку. Бо і тут жа не было соладка праваслаўным і шматлікія нашы манахі адпраўляліся галоўным чынам на Афон, які лічыўся непахіснай апорай манаства. Некаторыя выхадцы з Рэчы Паспалітай набылі там большую вядомасць. Адным з іх стаў Іван з Вышні, які ў польскай літаратуры выступае пад прозвішчам Вышынскі. Ён быў прыхільнікам крайняга аскетызму, быў у апазіцыі да г.зв. фанарыётаў (назва ад канстанцінопальскага квартала Фанар, дзе была сядзіба патрыярха), якія адкрываліся на новыя ўплывы з Захаду. Іван Вышынскі выступаў супраць засвойвання здабыткаў язычаскіх грэчаскіх і рымскіх культурных карыфеяў, быў за абмежаваннем асветы адно да штудзіравання Бібліі. Ён лічыў, што чалавечая мудрасць адштурхоўвае людзей ад Бога. Ягоныя апаненты, у сваю чаргу, называлі выхадца з нашай Рэчы Паспалітай апосталам невуцтва.

Пра іншую міграцыю, на багаслоўскім грунце, гаварыў сакоўскі архімандрыт а. Варсанофій. У час хваляванняў іканаборства, якое завяршылася ў Візантыі ў палове IX стагоддзя, дзесяткі тысяч манахаў пакінулі гэтую краіну і перасяліліся на захад: у Калабрыю і на Сіцылію. Здавалася б — якое дачыненне мае такая міграцыя да нашых з Візантыяй сувязей. Але наш прафесар Антон Мірановіч, адзін з выдатнейшых у агульным маштабе знаўцаў гісторыі праваслаўя, якога навуковы ранг прафесар Тэрэса Хынчэўска-Генель кампліментавала жартаўлівай мянушкай „capo di tutti capi" гісторыкаў-артадаксістаў, заўважыў, што нядаўна выяўлены сляды дзесятак ці нават соцень візантыйскіх манастыроў на тэрыторыі Мадзьяршчыны; праўда — былі гэта ўстановы значна меншыя за сённяшнія. І тут узнікае спакуса, ці не падацца далей у падказаным напрамку і паставіць пытанне: ці тыя візантыйскія падзвіжнікі гэтаксама масава не пранікалі і ў паўночным напрамку — у Валахію, Малдавію і крыху далейшае Падняпроўе? Бо, здаецца, не надта яшчэ вядома, чаму кіеўскі князь Уладзімір, які ў 980 годзе паставіў у сваёй сталіцы новы язычніцкі пантэон з залацістым Перуном на чале, трымаў яго толькі восем гадоў і ў 988 годзе зваліў сваіх свежанькіх багоў у Дняпро і прыняў хрысціянства. Ці ў ягоных падданых не быў ужо закладзены новы рэлігійны грунт?

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

9 770546 196000

Беларусы сто гадоў назад

Няскончаная, як заўсёды і ўсё ў Расіі, „первая русская революция 1905 года” наспявала даўным-даўно — ад скасавання прыгону ў 1861 годзе і Польскага (Студзеньскага) паўстання 1863 года. „Русский прогресс” праяўляўся толькі ў арміі, на будаўніцтве чыгунак і паўстанні фабрыкаў на французскія займы, а ўвогуле Расійская імперыя надалей існавала ў традыцыі Сярэднявечча — горш, чым Францыя перад 1789 годам. Саслоўныя прывілеі дваранства былі тыя самыя, як у часы Пятра Вялікага дзвесце гадоў назад. А „пяць беларускіх губерняў” — Віленская, Гродзенская, Мінская, Віцебская, Магілёўская — існавалі ў рэжыме... „мяккай акупацыі”, бо не было ні самакіравання, ні эканамічных свабодаў (каталікі і жыды не мелі права купляць зямлю etc.), ні фабрык, ні універсітэтаў, ні літаратуры з мастацтвам, нічога. Армія і адміністрацыя рускія, „панскі двор” польскі, мястэчка жыдоўскае, вёскі „тутэйшыя”... Такой была Беларусь. Некалькі паасобных і амаль ізаляваных узаемна рэлігійна-сацыяльных „народаў” на адной і той самай зямлі.

У цараванне апошняга расійскага імператара Мікалая II (з 1894 года) у „пяці губернях Паўночна-Заходняга Края” быў заведзены новы дзяржаўны інстытут — „земские начальники” — своеасаблівыя „неафіцыйныя” пасярэднікі паміж царскай адміністрацыяй і мясцовымі „крестьянами”. (Раней былі „мировые судьи” (!), а яшчэ раней... паліцэйскія „капитан-исправники”.) Свае абавязкі „земские начальники” выконвалі без казённага жолду (!), а губернатар іх не прызначаў, але „приглашал по выбору”, альбо былі гэта, пацяперашняму, незалежныя наглядальнікі і кансультанты. Іх рапарты былі асновай для далейшых рапартаў губернатараў у Санкт-Пецярбург, у канцылярыю Міністэрства ўнутраных спраў, і давалі яны самую поўную і сапраўдную карціну тагачаснага правінцыйнага жыцця. Іншая справа, што гэтую інфармацыю імперская сталіца ігнаравала, і для таго Расійская імперыя скончыла так, як яна скончыла...

Гродзенская губерня была падзелена на ўчасткі, за кожны з якіх адказваў свой „земский начальник”. Сакольскі, Гродзенскі, Беластоцкі і Бельскі паветы належалі да 1-га і 3-га ўчасткаў, дзе „земскими начальниками” былі падпалкоўнік рэзерва Аляксандр Курыла з Саколкі і „действительный статский советник” (такі чын мелі начальнікі чыгунак ці губернатары, у арміі гэта генералы!) Аляксандр Азнобішын з Мастоў-над-Нёманам. А propos, у канцылярыі губернатара ў Гродне яшчэ пяром рыпелі, а гэтыя двое ў Саколцы і Мастах ужо стукалі ў друкавальныя машынкі „рэмінгтон”, тагачасны найноўшы камп’ютэр...

Аляксандр Азнобішын гаспадарыў у Мастах-над-Нёманам разам з братамі Аляксеем і Георгіем (чацвёрты брат быў у 1905 годзе віцэ-губернатарам у Саратаве). Быў гэта „лесной помещик” — паставіў у сваім маёнтку тартак, з катлом і электрычнасцю, і прадаваў пілаваны лес немцам у Тыльзіт. У 1900 годзе заснаваў Гродзенскае таварыства сельскай гаспадаркі з „отделениями” (доследна-вопытнымі фальваркамі) у Лунне недалёка Скідаля і Заблудаве пад Беластокам ды сельскагаспадарчай школай. Таварыства мела хімічную і біялагічную лабараторыі, метэаралагічную станцыю, батанічны сад, найноўшую сельскагаспадарчую тэхніку, выдавала перыядычны часопіс, праводзіла семінары, выставы і курсы. Належалі да Таварыства сярод іншых (у 1912 годзе 73 чалавекі, пераважна памешчыкі) С. Незабытоўскі, князь Е. Сапега, Р. Скірмунт, Ю. Урсын-Нямцэвіч, барон М. Мантэйфель, адзін з гродзенскіх губернатараў М. Дабравольскі, князь С. Святаполк-Чацвярцінскі, прэм’ер-міністр Расіі ў 1907-1911 гадах П. Сталыпін і іншыя. Сам Аляксандр Азнобішын у 1912-1917 гадах быў дэпутатам IV Дзяржаўнай Думы Расіі ад Гродзенскай губерні, а далейшы яго след губляецца...

Пасля расстрэлу ў Санкт-Пецярбургу рабочай дэманстрацыі 9 студзеня 1905 года па ўсёй імперыі пракацілася хваля страйкаў і дэманстрацый пратэсту, найбольш моцныя ў Варшаве, Рызе, Коўне, альбо кругом „пяці беларускіх губерняў” — і са сталіцы быў накіраваны даволі панічны запыт: ці не перакінецца „революционный бунт”... на беларускую вёску? Ці не трэба заранёў абвясціць тут ваеннае становішча і накіраваць сюды адборныя казацкія войскі?! У сталіцы цьмяна ўяўлялі, у якой краіне жывуць...

І вось які рапарт напісаў Аляксандр Азнобішын, а за ім паўтарылі слова ў слова шэф аддзела зямельных спраў Гродзенскай губерні А. Шчарбіцкі і губернатар М. Асаргін:

— Рэвалюцыйныя пракламацыі ў наваколлях Гродна і Беластока заклікаюць сялянаў іменем Цара выгнаць памешчыкаў і адабраць у іх зямлю... Эканамічнае становішча сялянаў прыгнечанае, і з кожным годам толькі горш і горш... З часоў скасавання паншчыны ў 1861 годзе прайшло больш сарака гадоў, два актыўныя пакаленні, і за гэты час лік насельніцтва падвоіўся, а шмат дзе патроіўся (!), між тым зямлі не паболела, а гэта часта адзіная крыніца існавання сялянаў-беларусаў. Каб павялічыць ворнае поле, ужо разворваюць сенажаці і выпасы, ад таго менш скаціны, для таго менш гною, і па назіраннях старшых людзей, за тыя ж сорак гадоў ураджаі паменелі на чацвёртую долю і болей... Многім хапае свайго хлеба толькі да Калядаў (!!), а добрым гаспадаром лічыцца той, хто мае свой хлеб да Вялікадня... У такой нястачы браты аддзяляюцца ад братоў, дзеці ад бацькоў, гаспадаркі драбнеюць... Цяпер няма ў сялянаў дадатковых заробкаў, як на вырубках лесу памешчыкамі ці будоўлі чыгунак, таму што чыгуначнае будаўніцтва ў асноўным завершанае, а лес перакуплены спекулянтамі-манапалістамі жыдоўскага паходжання, якія плацяць чатырохкроць менш, чым 20 гадоў назад „панскі двор”... Адначасова змяніўся сялянскі быт і адбылася нейкая „беднасць ад паляпшэння” — газавыя лямпы замест лучыны і печы з комінам замест курных — і цяпер на газу і дровы, якія прадае толькі жыдоўскі гандляр, звычайны селянін змушаны выдаваць... пятую долю (!) усіх грошай, якія заробіць за год! Чыгунка адабрала такі заробак, як дастаўка коньмі грузаў для войска, фабрыкі выцяснілі майстроў-саматужнікаў; цэны на „городские товары” растуць, а на сялянскую прадукцыю малеюць, і яшчэ ёсць шмат другіх, „мясцовых”, прычын у паасобных паветах і гмінах...

„Пры панах было лепей” (гэта значыць, „пры паншчыне”, да 1861 года — А. Ч.), такое сцвярджэнне можна пачуць у вёсках амаль паўсюдна. Галоўную прычыну сяляне бачаць у тым, што „маладыя паны жывуць не па-людску, таму што старыя паны і ў лес пускалі, і касіць ды пасвіць пускалі, і пазычалі ў лі-хі год, а ў маладых адны грошы ў галаве, і межы кругом, і стражнікі, і ўсё не па-людску!.. Беларускі селянін, у большасці сваёй, не можа абысціся без „панскага двара”. Без сталага, моцнага і застрашальнага (!) вонкавага ўціску мне цяжка ўявіць, каб у Гродзенскай губерні ўзнік арганізаваны сялянкі рух, скіраваны нават супраць памешчыкаў, не гаворачы пра дзяржаўную ўладу, з прычыны таго, што характар беларусаў пазбаўлены ініцыятывы і рашучасці, а для таго для захавання ў губерні спакою тут дастаткова той паліцыі, якая ёсць... Але я абавязаны адзначыць, што незадаволенасць беларускіх сялянаў сваім жыццём увогуле цвёрдая і нязменная, і вось яе галоўныя прычыны:

— малазямелле ад перанаселенасці, калі адступіў голад, бо ў 70-х гадах (XIX ст. — А. Ч.) паўсюдна прызвычаіліся да бульбы, якая замяняе хлеб;

— „стойковая и дорожная повинность”, альбо дармовая праца на казённых работах, як было пры паншчыне (направа дарог і мастоў, дастава сваімі коньмі павятовых і губернскіх урадаўцаў, дзяжурства па тыдню і больш на пастарунках „земской вспомогательной полиции” etc.);

— „местные особенности” (у Шудзялаве „глухое недовольство католиков”, бо там зачынілі дзяржаўную двухкласную школу і замест яе адчынілі „церковно-приходскую”, для чаго антаганізм паміж праваслаўнымі і каталікамі, якога раней не было (!!), узнік „дзякуючы” паўстанню непажаданай арганізацыі школаў, не зважаючы на рэлігійны склад мясцовага насельніцтва);

— Сялянскі Зямельны Банк скараціў да мінімуму (!) свае фінансавыя абароты, не дае сялянам крэдытаў, спрабуе штучна падняць цэны (!) і больш зважае на старыя інструкцыі, чым на рынак, а разрыў дзяржаўных і рынкавых цэнаў на зямлю ёсць асновай усялякіх спекуляцый і хабарніцтва коштам сялянаў;

— у сувязі з тым, што вайна з Японіяй ідзе ўжо год (са студзеня 1904 года — А. Ч.), а наша армія церпіць няўдачы і паражэнні, беларускае сялянства надзвычай занепакоенае чуткамі пра мабілізацыю, і, на маю думку, толькі мабілізацыя можа падштурхнуць беларускага селяніна да адкрытага супраціву ўладам...

На думку ж як начальнікаў валасцей (gmin) і ўездаў (powiatów), так сельскіх старостаў (sołtysów), калі нават пачнуцца „беспорядки”, то скіраваныя яны будуць выключна супраць жыдоў, хоць апошнія (падпольная партыя Бунд — А. Ч.) усяляк імкнуцца ў сваіх пракламацыях накіраваць сялянскую нянавісць супраць памешчыкаў і нават дзяржаўнай улады...

Нянавісць простага народа да жыдоў грунтуецца на ўхіленні жыдоў ад вайсковага абавязку падчас вайны, і за іх спекуляцыю ды сталы рост цэнаў, і гэтая нянавісць так моцная, што ўплыў антыўрадавых жыдоўскіх радыкалаў нікчэмны, і няма ў ім ніякай пагрозы. Хутчэй я чакаў бы „еврейских погромов” (!), што нам было б крайне непажадана, таму што гэта ўзмоцніла б не жыдоўскую эміграцыю, а жыдоўскіх падпольных радыкалаў...

Вясна і лета 1905 года ў „пяці беларускіх губернях” прайшлі спакойна — так, як прарочыў Азнобішын. Сапраўды рэвалюцыйны рух быў у „Привисленском Крае”, альбо ў Варшаве і Лодзі, таксама ў Рызе, Рэвелі, Коўне, Вільні, Мінску, Кіеве, Адэсе. Былі таксама і „еврейские погромы” — у Беластоку (найбольшы!), Полацку, Гомелі... А вось „крестьянское движение” праявілася толькі ва ўхіленні ад вайсковай службы, нечуваным раней п’янстве (!!) і ... нападах на „казённые винные лавки и почтово-телеграфные станции” (па гарэлку і грошы), альбо найбольш актыўнымі ў 1905 годзе былі крымінальнікі і люмпенпралетарыят, зрэшты, як у любым „сялянскім руху”.

У канцы мая 1905 года быў разгромлены пад Цусімай ля японскіх берагоў рускі флот — з блізка пяцідзесяці (!) баявых караблёў і транспартаў прарваліся ва Уладзівасток... толькі тры. Такога разгрому ў Расійскай імперыі не было за ўсю яе гісторыю. Царызм мог быць проста змецены, бо нават армія ад яго адхіснулася, прэм’ер-міністр Вітэ бачыў паратунак у рэформах, якія царскі двор менаваў „уступкамі”, ужо рыхтаваўся Маніфест 17 кастрычніка 1905 года — палітычная амністыя, выбары ў Дзяржаўную Думу, свабода слова, сходаў, друку etc. etc. А напярэдадні тых „рэформаў” сталічнае Міністэрства ўнутраных спраў ізноў слала губернатарам панічныя „циркуляры”, а тыя прасілі пра інспекцыйныя паездкі і рапарты сваіх „земских начальников”.

У верасні 1905 года „начальник 3-го Гродненского участка” Аляксандр Азнобішын на тыя самыя запыты пра „крестьянские волнения” адказвае даслоўна наступнае, што „вайсковыя ці паліцэйскія сілы неабходна размяшчаць з такім разлікам, каб яны здольныя былі паспяваць не post factum, але antyfactum — не пасля пагрому ці рабунку, але заранёў, каб не дапусціць яго, для чаго дастаткова двух-трох казакоў у кожны з трох-чатырох найважнейшых у павеце двароў, а не ўзвод у кожнае мястэчка ці швадрон на павет”, а далей выкладае цэлую праграму, якая выглядае як план аграрнай рэформы ўсіх „пяці беларускіх губерняў”:

[працяг ☞ III]

Якуб Колас як настаўнік

Я. Колас вядомы як вялікі народны паэт і пісьменнік Беларусі. Свой жыццёвы шлях пачынаў Колас з настаўніцтва. У 1898 годзе будучы пісьменнік паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, дзе набыў ён грунтоўныя веды па літаратуры, дзе захапляўся творамі рускіх і замежных класікаў. Скончыўшы ў 1902 годзе настаўніцкую семінарыю Колас паехаў працаваць настаўнікам на Палессе. Першыя гады яго настаўніцтва прайшлі на Піншчыне ў вёсках Люсіна і Пінкавічы. У „Аўтабіяграфіі" Колас пісаў: „Я толькітолькі ўступіў у жыццё. Сваю работу скромнага сельскага настаўніка я лічыў самай пачэснай. Перада мною стаяла вялікая адказная задача — усімі сіламі, усім сэрцам служыць працоўнаму народу".

Многа гадоў пазней у пісьме любімаму вучню Міхасю Заньку паэт прызнаваўся: „Я вельмі рад прыгадаць былое, свае маладыя гады, сваю першую школу, дзе я быў настаўнікам і сваіх вучняў... Люсіна я ніколі не забуду. Я памятаю Люсінскую школу... Помню я і сваю бабку Мар'ю".

У аповесці „У палескай глушы" Колас апісаў вёску і люсінскую школку: „Школа стаяла на рагу двух вуліц... На перасеку гэтых вуліц, каля саменькай школы стаяў высачэзны крыж... Гэты высокі пануры крыж і гэта закінутая сярод палескіх трушчобін школа стаялі як сіроты, і, здавалася, цесна туліліся адно да другога". Школы тае даўно няма. Цяпер мясцовая моладзь вучыцца ў прасторнай светлай школе з цэглы. Першая праца і вучні астаюцца ў памяці назаўсёды. У 1952 г. Колас пісаў жыхарам вёскі Пінкавічы: „Амаль паўвека мінула з тых дзён, калі я, тады яшчэ юнак, прыехаў у вашу вёску, у школу. У маіх вачах і сягоння ўстаюць малюнкі пінкавіцкіх і вышавіцкіх ваколіц, зарэчныя прасторы балот, заросшых чаротамі, і жыццярадасны народ, хоць бедны і заціснуты скірмунтамі, царскімі чыноўнікамі, жандарамі і паліцыяй".

У Люсіне і Пінкавічах малады настаўнік пазнаёміўся з нелегальнай рэвалюцыйнай літаратурай. Газеты радыкальнага характару, японская вайна, гутаркі з настаўнікамі і сялянамі накіравалі Коласа на рэвалюцыйны шлях. У той час пачыналася першая руская рэвалюцыя.



100 гадоў назад, у 1906 годзе настаўніка Міцкевіча ўлада перавяла з Пінскага павета ў Ігуменскі за рэвалюцыйную прапаганду між сялянамі. Летам 1906 года Якуб Колас прымае актыўны ўдзел у скліканні нелегальнага з'езда настаўнікаў, які адбыўся на яго радзіме ў Мікалаеўшчыне. За ўдзел у гэтым з'ездзе Колас быў звольнены з пасады настаўніка і аддадзены пад нагляд паліцыі. Віленскі суд 15 верасня 1908 года прыгаварыў паэта за напісанне рэвалюцыйнай пракламацыі да 3 гадоў турэмнага заключэння. Пасля выхаду з мінскага астрога ўдалося Коласу з цяжкасцямі атрымаць працу настаўніка ў Купічах каля Пінска, адкуль пераехаў ён у Пінскае прыхадское вучылішча.

Летам 1915 года да Беларусі дакацілася першая сусветная вайна, якая закінула сям'ю Коласа ў глыб Расіі.

Першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Якуб Колас настаўнічаў на Куршчыне, у сяле Ліпавец, дзе адчыніў хату-чытальню і арганізаваў бібліятэку. Вучань Коласа С. Мезенцаў успамінаў: „Я стаў пісьменням толькі дзякуючы добрым адносінам да нас, дзяцей беднаты, нашага настаўніка Канстанціна Міхайлавіча... Многіх дзяцей бацькі не хацелі пускаць у нашу школу. Не хадзіце да гэтага настаўніка, — казалі яны, — там, у новай школе, божаму закону не вучаць". Даведаўся аб гэтым Канстанцін Міхайлавіч і пачаў абыходзіць дамы, тлумачыць бацькам, што савецкая ўлада хоча зрабіць усіх дзяцей адукаванымі і культурнымі".

У лютым 1920 года Колас пераязджае ў горад Абаянь і атрымлівае пасаду павятовага школьнага інструктара. Абхадзіў палавіну Куршчыны, выстараўся настаўніцкую пасаду і жонцы Марыі Дзмітраўне.

Селянін вёскі Ліпавец І. Дутаў пісаў так: „Шкада было нам свайго настаўніка: добры быў чалавек, уважлівы да нас сялян-беднякоў. Вучыў розуму, часта праводзіў у школе сходы бацькоў, пераконваў нас, каб кожны стараўся даць сваім дзецям асвету, тлумачыў, што савецкая ўлада дала нам, мужыкам, такое права і магчымасць... Добрага чалавека не хутка забудзеш".

У маі 1921 г. Колас пераехаў у Мінск, дзе з 1922 па 1930 год працаваў выкладчыкам у Беларускім педагагічным тэхнікуме. Былы студэнт тэхнікума так запамятаў свайго выкладчыка: „Канстанцін Міхайлавіч ніколі не чытаў лекцый. Ён гутарыў, стараючыся ўцягнуць у гутарку пабольш прысутных. Нашы прозвішчы ён называў адразу, не заглядаючы ў журнал. Памяць у дзядзькі Якуба была надзвычай добрая. Ён любіў педагагічную працу і ў клас заўсёды прыходзіў з прыўзнятым, бадзёрым настроем, усміхаўся. І нам думалася, што ў яго ніколі не было смутку, цяжкіх хвілін, што ён ніколі не хваляваўся. Як жа мы памыляліся! Можа, ніхто так прачулена не перажываў чалавечае гора, як дзядзька Колас".

З снежня 1923 года загадам народнага Камісарыята Асветы БССР Колас зацвярджаецца дацэнтам педагагічнага факультэта БДУ. Студэнт універсітэта У. Гутараў пісаў: „Я хадзіў на заняткі да Якуба Коласа. Якуб Колас быў уважлівы, добры, задуменны... Гаварыў ён ціха, павольна, ласкава, але з вельмі багатай, задушэўнай інтанацыяй у голасе і тонкімі адценнямі ў міміцы. Лоб, бровы, вочы нават губы і шчокі яго нібы змяняліся ў адпаведнасці з характарам думкі, станавіліся больш сціснутымі, напружанымі ці больш павольнымі, мяккімі. Часам па нашай просьбе Якуб Колас замест тлумачэння лінгвістычных законаў чытаў нам урыўкі са сваіх твораў".

18 кастрычніка 1926 г. у сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці ўрад БССР надаў Коласу званне народнага паэта і назначыў яму пажыццёвую пенсію. З гэтага часу пісьменнік паступова адыходзіць ад педагагічнай дзейнасці. Як пенсіянер Колас мог цалкам прысвяціць свой талент літаратурнай творчасці і аддацца грамадскай працы.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

[II ☞ працяг]

— Каб вырашыць „аграрные беспорядки" і ўстанавіць парадак, трэба найперш ліквідаваць прычыны тых „беспарадкаў". Галоўныя ж прычыны наступныя: 1) нізкі ўзровень культурнага развіцця (!) беларускай вёскі; 2) цяжкае гаспадарчае становішча з прычыны цяжкіх умоў земляробства. Для ліквідацыі першай прычыны неабходная ўсеагульная народная асвета, якая давала б не толькі неабходныя веды, але практычныя здольнасці ў земляробстве і рамёствах, а таксама павагу да чужой уласнасці, без чаго культурнае жыццё вясковай супольнасці непамыснае. Для ліквідацыі другой прычыны неабходна наступнае: а) падначаленне сялянаў агульнаму праву і ліквідацыя саслоўных інстытутаў, калі для кожнага класа дзейнічаюць асобныя законы і правілы; б) ліквідацыя сацыяльнай адасобленасці сялянаў, як „изгоев"(!), і паліцэйска-адміністрацыйнай апекі над імі; в) перагляд усяго „межевого" (зямельнага) права, якое мае быць простым, ясным і танным (!!) для селяніна; г) абавязковая ліквідацыя сервітутаў (землі „супольнага карыстання" двара і вёскі — А. Ч.), ліквідацыя „шахаўніцы"; д) арганізацыя і дзяржаўнае фінансаванне „переселенческого дела" (каланізацыя Сібіры — А. Ч.); е) перабудова ўсяе працы Сялянскага Банка; ж) ліквідацыя „выкупных платежей" (штогадовая плата за „царскую зямлю", атрыманую ў рэформу 1861-1868 гадоў — А. Ч.); з) устанаўленне роўных маёмасных правоў і падаткаў для ўсіх „сословных" станаў грамадства; і) ліквідацыя „звычаёвага права" ў любых формах; к) самае шырокае развіццё меліярацыі, асушэнне балотаў і будаўніцтва гідратэхнічных вузлоў (!) коштам дзяржаўнага бюджэту і продаж гэтых зямель сялянам па самай нізкай магчымай цане.

Калі ўважліва пачытаць „аграрную праграму Азнобішына", а propos, простую, ясную... і недарагую, то лёгка заўважыць, што царскія „сталыпінскія рэформы", польская „камасацыя", савецкая „калектывізацыя" гэта толькі паасобныя часткі з цэльнага плана аднаго „лясного памешчыка" 1905 года.

Але сёння ўражвае штосьці іншае. На першым месцы, перад эканомікай і палітыкай, пастаўленая культура. Насуперак модным тады і цяпер марксізму і лібералізму. Культура як спосаб жыцця і побыту. Не пагалоўныя і дзяржаўна-прымусовыя „асвета і адукацыя", але прафесійная падрыхтоўка і павага да чужой уласнасці і чужога розуму. Чаго бракавала ў той час і бракуе цяпер, што тады легкаважылі і цяпер легкаважаць палітыкі, філосафы, гаспадары і літаратары.

І цяпер засталося пракаментаваць легенду пра „рэфарматара Сталыпіна", з якім носяцца сучасныя рускія нацыяналісты. „Рэформы Сталыпіна" гэта дзесятая доля з аднаго рапарта Аляксандра Азнобішына. Ковенскі памешчык Сталыпін у сваім „пасляпольскім" маёнтку не жыў і не гаспадарыў, у Гродне быў губернатарам... з восені 1902 да вясны 1903 года, а з Азнобішынымі блізка пазнаёміўся ў Саратаве, дзе быў губернатарам чатыры гады (!), і адкуль пачалася яго кароткая палітычная кар'ера „спасителя империи".

(працяг будзе)

Алесь ЧОБАТ

Такое было жыццё

Успаміны Надзеі САХАРЧУК з Маліннік, народжанай у 1923 годзе.

Мае бацькі Яфім і Софія пажаніліся ў бежанстве, калі ім было па васемнаццаць гадоў. У бежанства ў 1915 годзе з Пашкоўшчыны падаліся амаль усе, астаўся хіба толькі Калінка. На Пінскіх балотах памерла татава мама Марыя і астаўся ён зусім сам, бо татаў бацька Рыгор памёр яшчэ раней, калі тату было дзевяць гадоў. А мая мама ехала ў бежанства са сваімі бацькамі Рыгорам і Варварай. Калі заехалі ў Расію тата вельмі хацеў адшукаць сваю нарачоную, значыць маю маму. А мама ўжо працавала ў Расіі ў яўрэяў. Пасля яна мне расказвала, што яўрэі жылі ў Расіі як вялікія паны, часта гасціны спраўлялі. А калі прыходзілі госці, яны разбуваліся з галёшаў, якія калісь накладалі на боты, а мама тыя галёшы парадкавала і чысціла, а яўрэі ёй за гэта плацілі. І калі была гасціна, то мама заўсёды цешылася, што крыху заробіць.

А тата ўсё шукаў сваёй нарачонай з Пашкоўшчыны і знайшоў! Яўрэйка стала заўважаць татавы захады, але ёй мама сказала, што гэта брат да яе ходзіць. Тата ўладзіўся там садаводам, даглядаў сад. І так яны там жылі каля сябе і трэба было пажаніцца. Яны ўзялі шлюб, нарадзілася ў іх дзяўчынка. У 1921 годзе яны падаліся вяртацца на радзіму.

Вярталіся возам з парай коней і дабром, якое нажылі ў Расіі. Мама была цяжарная з другім дзіцём і ў дарозе пачаліся роды. Маму забралі ў радзільны дом, пабыла яна там некалькі дзён і зноў у дарогу з нованароджаным дзіцём.

Ехалі-ехалі і даехалі да пантоннага моста на нейкай рацэ. Разам з намі ехала другой фурманкай і сям'я Стасюкоў з Пашкоўшчыны і пра гэтае здарэнне, як і пра вельмі добрых людзей у Расіі, расказаў мне Іван Стасюк. Быў гэта вузкі мост і, пад'ехаўшы да яго, трэба было разглянуцца, ці ніхто не едзе насупраць, бо не было месца мінуцца. Ну і нашы ўехалі парай коней і з двойкай малых дзетак у возе на вольны мост, і калі яны ўжо былі на ім, з супрацьлеглага боку ўехаў нейкі дурань, да таго ж з жарабцом у аглоблях! Калі Стасюк мне пра гэта расказваў, то мне аж цела дранцвела; а што тады перажывала мама! Але едуць. А той чалавек з жарабцом затрымаўся, зняў пінжак і завязаў ім свайму каню галаву. І ўзялі адзін воз паднеслі ўбок, каб мінуцца. І так праз той мост пераехалі. Слава Табе, Божа, — гаварыў Стасюк, — едзем дадому.

У Пашкоўшчыне будынкі стаялі і я яшчэ з тае хаты пайшла замуж. Тата расказваў, што калі вярнуліся, то ўсюды рос арэшак — горная канюшына. Накасілі і навазілі поўную клуню сена. Было дзе жыць, але калі вярнуўся з Расіі дзядзька Даніла са сваёй сям'ёй, то ў прысценку зрабіў сабе хату і так жыў.

Сям'я наша была шматлікая. Бацькі пажылі ў Пашкоўшчыне два гады і нарадзілася я. Было тады так, што мама праз кожныя два гады нарадзіла сямёра дзяцей, спачатку саміх дачок: Кацю, Маню, мяне — Надзю, Веру, Ніну і Жэню, а наканец і сына Колю.

У школу хадзіла я сем гадоў і закончыла чатыры класы. Далей, у Орлі, вучыцца не было як. Хто меў ровар, як Сойка ці Валодзя Стасюк, той даязджаў у Орлю. А мы пяшком не

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Надзея Сахарчук

захацелі і я з сястрой Марыяй пайшла на працу да агароднікa Івана Яканюка, які жыў за вёскай.

Калісь у Пашкоўшчыне былі толькі чатыры садочкі. Мы ў свайго гаспадара запрацавалі прышчэпкаў для свайго садка і некаторыя дрэвы растуць па сённяшні дзень. У агароднікa мы навесну садзілі цыбулю, памідоры, квяцістую і белакачановую капусту. Пасля пасадкі зараз трэба было палоць і так аж да сенакосаў. Гаспадар плаціў нам па залатоўцы за дзень, а калісь за дзве залатоўкі можна было купіць паўлітровую бутэльку гарэлкі. А ў сенакос плаціў нам ужо па паўтара злота, за цэлы дзень, да вечара.

Збожжа жалі сярпамі. І калі выжалі ў агароднікa, то зараз прыязджалі наймаць мяне гаспадары з вёскі; у Спічках наймалася я ўжо жаць, калі мне было пятнаццаць гадоў. Калі пачалася нямецка-польская вайна, то плацілі ўжо па два з паловай злотага (раней па два злоты), бо наступала разруха і трэба было пільна сабраць збожжа. Помню, што зарабіла я тады пяць злотаў. Тата купіў мне ў Бельску чаравікі і паўпаліто, а пяць злотаў дала я маме, каб купіла мне ў яўрэяў хустку-шаляноўку, але мама пашкадавала грошай, сказала, што задорага. Ну і я з тымі грашамі пайшла замуж — як кінула іх у куфэрак, то пасля імі хіба дзеці гулялі; не ведаю, куды яны ў мяне потым дзеліся. Такое, вось, было жыццё.

У акупацыю каля Маліннік прызямліўся ці разбіўся паветраны шар з трыма немцамі. Пазбягаліся людзі. І зараз з'явілася нямецкае войска. Найперш ехалі веласіпедамі, пасля матацыкламі, самаходамі. А нашы людзі стаялі з другога боку шашы. І спыніўся самаход. Нам стала страшна, хаця нас многа было. Адзін немец стаў махаць рукамі і крычаць „So Schöne! So Schöne!" Нехта скеміў, што кліча мяне: „Такая прыгажуня, такая прыгажуня!" І той немец даў мне прыгожыя ружовыя каралі і доўгую бляшанку з рыбнымі кансервамі; засмяяўся і паехаў. А пасля ехалі танкі і мы давай дадому. Гэтак выглядала першая сустрэча з немцамі.

Ляціць самалёт з вялікім гулам. І ён каля Пашкоўшчыны, насупраць нашай пашы, прызямліўся, а ад самой шашы выкінуў такі канат з крукам, каб затрымацца. То людзі зноў пачалі бегчы, бо то ніколі самалёта не бачылі. Гэта было ў суботу, а ў нядзелю на вёсцы пазбіраліся хлопцы і дзяўчаты — шэрняўцы, тапчыкальцы, маліннікі — поўна! А немцы хадзілі і гергаталі. Адзін з немцаў умеў гаварыць па-польску і прычапіўся да мяне, каб я назаўтра прыйшла да іх, то яны мяне сфатаграфуюць. А я адказала, што не хачу, што баюся. У наступны дзень я пайшла ў поле капаць бульбу і тыя немцы завіталі да нашай хаты — мама акурат хлеб у печ устаўляла — і распыталі, дзе я ў полі. І прыйшлі ў поле: „Dzień dobry" і „Boże dopomóż" кажуць, і зноў намаўляюць мяне сфатаграфавацца, і адбою ад іх няма. І пайшлі за мною дахаты, я пераапранулася, хаця гаварылі, што і так добра. Гаварылі, што здымак у газеце будзе і мне той здымак прышлюць. Сфатаграфавалі і пытаюць, ці я калі самаходам ехала. А дзе там ехала! Як цяпер няма каня на вёсцы, так калісь не было самахода; цяпер радасць, калі ўбачыш, як хтось каня вядзе вуліцай. Пасадзілі за рулём старога шафёра, прывезлі мяне ў Маліннікі, пад Пашкоўшчыну шашой да таго самалёта, што быў прызямліўся. Ці я баялася; мне ж тады было пятнаццаць гадоў? Калі за руль сеў стары шафёр, то ўжо не.

Але ўжо да мяне тады хадзіў мой малінніцкі залётнік Алёшка. Якаясь старая баба заўважыла мяне і зараз нагаварыла маёй будучай цешчы, што я валачуся з немцамі. А я свайму Алёшку ўсё расказала, што начапіліся...

І было весела, было добра. Але ж колькі таго дзявоцтва — у васемнаццаць гадоў, у 1942 годзе, пайшла я замуж. Тата не згаджаўся, бо я была „яшчэ маладзенькая" і як рабіць вяселле, калі няма дома аднаго дзіцяці — мая старэйшая сястра Марыя была на прымусовых работах у Германіі. Але і Алёшы малодшы брат быў таксама ў Нямеччыне... Мы з Алёшкам так да сябе хацелі, што аж-аж; абы толькі пажаніцца. І хаця бедныя былі, аднак думалі: „Нам багацце непатрэбнае, абы міленькая душа і жыць будзем, усяго нажывем".

Загаварылі, што вайна, што Брэст бамбяць. На станцыі ў Рыгораўцах эшалон астаўся; чаго толькі ў ім не было: у бочках сала і рыба, тканіны, чай. То нашы людзі з Маліннік і іншых вёсак усяго панабіралі, бо той эшалон разбілі і не было гаспадара. А я тады была акурат у сястры Каці, удавы, якой мужа ў 1941 годзе паклікалі ў „действительную" службу ў Расію.

Саветы ганялі да работы цэлыя вёскі, нейкія шлюзы капаць, у цяперашняй Беларусі. А калі адыходзілі, то намаўлялі нашых, каб выязджалі ў Расію і адсюль, з Маліннік, крыху людзей паехала.

Пасля вайны на гэтай вуліцы, дзе мы жывём, было мо толькі з пяць дамоў, а пасля людзі пачалі будавацца на другім канцы сваіх пляцоў, што ўздоўж шашы; цяпер там многа дамоў. Мы дакупілі сыну пляц на другім баку вулічкі; другі сын жыве ў Кляшчэлях.

Была я ў ліку заснавальніц калектыву „Малінкі". Прыехаў Сцяпан Копа, я паклікала адну жанчыну і мы тады спявалі цэлы вечар. У калектыве я праспявала некалькі гадоў, але зламала нагу і ледзь хаджу з мыліцамі. Цяпер спяваю толькі ў нашай царкоўцы; службы тут адбываюцца кожную другую нядзелю.

У вёсцы калісь было Кола гаспадынь, там вучылі варыць і выпякаць, але я туды не хадзіла, сама па сабе ўсяго навучылася. Бо хто мае ў галаве, таму не трэба вельмі вучыцца; былі такія курсанты, якім нічога з тых курсаў не атрымалася. Я шмат разоў выпякала размаітыя выпечкі пад вяселлі. У мяне работа гарэла, я кіравала памочніцамі, пра ўсё помніла, што куды трэба даць. Яшчэ нядаўна, два гады таму, на просьбу Аліцыі Собунь, былой дырэктар арлянскага Гміннага асяродка культуры, ездзіла я на выставу ў Варшаву, вазіла туды свае мазуркі, пасху, пісанкі; былі там народныя ўмельцы з цэлай краіны. Былі таксама і іншыя прапановы выездаў, але яны не на маё цяперашняе здароўе.

У Малінніках многія людзі ў пасляваенны час займаліся тканнем саламяных цыновак, якія забірала „Цэпэлія". Варыш абед і наглядаеш за кроснамі. Маю яшчэ кросны, якім столькі ж гадоў, што і мне. Некаторыя, што разумнейшыя былі, дарабіліся на цыноўках пенсіі. І я хацела аплачваць складчыны, але мой сказаў, што і адной пенсіі хопіць. Яшчэ крыху дарабляю саламяных цыновак на продаж. За адну пляцёнку даўжынёю ў два метры і шырынёю ў восемдзесят сантыметраў плацяць цяпер сем злотаў; вытканне такой займае мне сёння некалькі гадзін, а калісь спраўлялася з такой работай у адну гадзіну.

А колькі ж можна працаваць? У маі пайшоў шосты год, як я аўдавела. І я буду збірацца на той свет, да свайго Алёшкі. Але яшчэ мая свечка не дагарэла, яшчэ жыву.

Запісаў Міхал МІНЦЭВІЧ